ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дармовым дадаткам „Прафрух“)
На 1 мес. . . . — 90 к.
„ 3 мес. . . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . . 5 р. —
„ 12 мес. . . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншагародняя абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. надбавкі.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЮ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
» абвестак . . 7-81

АЎТОРАК 20 мая 1930 г.
№ 116 (3714)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ і ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

Аб абгаварэньні тэзісаў да 16 партзьезду

[illegible]ва Палітбюро ЦК УсеКП(б) ад 18-га мая 1930 г.

[illegible]чікаваць ухваленыя Палітбюро ЦК тэзісы да 16-га зьезду Ус[illegible]гаварэньня іх на партсходах і ў друку.

[illegible] пры «Правде» «Дыскусійны лісток», у якім друкаваць [illegible]артыкулы, папраўкі да тэзісаў ЦК, канкрэтныя прапановы да тэзісаў і г. д.

Тэзісы ленінскага ЦК УсеКП(б)—у масы

Уся наша партыя праводзіць зараз вялізарнейшую работу па падрыхтоўцы XVI партыйнага зьезду. Усе партыйныя арганізацыі зьнізу да верху правяраюць сваю работу, правяраюць, як яны праводзілі ў жыцьцё дырэктывы нашай партыі. Вядзецца вялізарнейшая работа па выпраўленьні дапушчаных памылак, па далейшым яшчэ большым узмацненьні сацыялістычнага будаўніцтва ў горадзе і вёсцы.

Цэнтральны Камітэт УсеКП(б) публікуе сёньня тэзісы тав. Якаўлева па пытаньні: «Калгасны рух і ўздым сельскай гаспадаркі». Гэтыя тэзісы зьяўляюцца дакумантам вялізарнейшай палітычнай важнасьці. Гэтыя тэзісы падагульваюць вынікі ўсёй практыкі нашага сацыялістычнага будаўніцтва ў вёсцы за 2½-гадовы прыяд ад XV да XVI партыйных зьездаў. Партыя на працягу гэтага прыяду забясьпечыла паварот вёскі да сацыялізму. У выніку вялізарнейшай работы па разьвіцьці індустрыялізацыі краю, па масавым каапэраваньні, па арганізацыі машынна-трактарных станцый, па разьвіцьці саўгасаў, па ўзмацненьні наступленьня на капіталістычныя элемэнты ў вёсцы, на аснове нашага саюзу з серадняком, па ўзмацненьні работы сярод беднаты, мы дабіліся пералому ў разьвіцьці сельскай гаспадаркі СССР.

Наша партыя дабілася вялізарнейшых посьпехаў у справе калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва на аснове суцэльнай калектывізацыі. На падставе масавага разьвіцьця калгаснага руху, які ахапіў на 1 мая 1930 г. у асноўных збожжавых раёнах каля 40-50 проц. сялянскіх гаспадарак, на плошчы да 30-35 мільёнаў гэктараў (ня лічачы азімавага кліну), партыя вырашае на справе асноўную найтруднейшую праблему сельскай гаспадаркі — збожжавую праблему. Капі ў прыяд XV зьезду і XVI партыйнай канфэрэнцыі пераважная часьць таварнай зернявой прадукцыі вытваралася індывідуальнай сялянскай гаспадаркай, у тым ліку і кулацкай, дык ужо ў 1930 г. у выніку масавага разгортваньня калгаснага руху асноўную часьць таварнай зернявой прадукцыі дадуць калгасы і саўгасы.

Гэтых дасягненьняў партыя дабілася толькі на аснове жорсткай барацьбы супроць правых апартуністых, супроць тэарэтыкаў мірнага ўрастаньня кулака ў сацыялізм, супроць пібэральна-буржуазных тэорый, супроць прадстаўнікоў тэорыі і практыкі «самацёку». Гэтых дасягненьняў партыя дабілася толькі ў барацьбе супроць «левых» трацкістых і паўтрацкістых, супроць антысерадняцкіх перагібшчыкаў. Гэтых дасягненьняў мы дабіліся толькі на аснове пасьлядоўнага правядзеньня генэральнай лініі партыі.

Пералом у разьвіцьці Савецкага Саюзу заключаецца ў тым, што значная частка серадняцкіх мас, сьледам за беднякамі, зразумела пераважнасьць буйное, абагуленае гаспадаркі, павярнула добраахвотна, іменна добраахвотна, на сацыялістычны шлях, што ў выніку разьвіцьця калгасаў і саўгасаў і разгорнутай работы па ліквідацыі кулацтва, зьмяняюцца самыя суадносіны эканамічных укладаў гаспадаркі, бо капі раней сацыялістычныя адносіны ў СССР апіраліся амаль выключна на сацыялістычную прамысловасьць, дык з гэтага моманту яны пачынаюць апірацца таксама на сацыялістычны сэктар сельскае гаспадаркі. У сувязі з гэтым, пановаму ставіцца таксама зараз і пытаньне аб нашай апоры на вёсцы. З гэтага моманту «ў важнейшых збожжавых раёнах СССР вёска падзяляецца на дзьве асноўныя часткі: на калгасьнікаў, якія зьяўляюцца сапраўднай і моцнай апорай савецкай улады і на некалгасьнікаў з беднатой і сераднякоў, якія яшчэ пакуль ня хочуць уступіць у калгасы, але якіх масавы вопыт калгасаў бясспрэчна пераканае ў адносна кароткейшым тэрміны ў неабходнасьці ўступіць на шлях калектывізацыі». Пералом у разьвіцьці СССР зьяўляецца пераломам сусьветнага гістарычнага значэньня. Разьвіваючы ўсё больш калгасы і саўгасы, перарабляючы бядняцка-серадняцкія гаспадаркі на сацыялістычны лад, партыя на практыцы мільёнаў паказвае перавагі сацыялізму перад капіталізмам, даводзіць на вопыце правільнасьць марксыцка-ленінскага вучэньня аб пабудове сацыялізму ў нашым краі.

У радзе раёнаў і месц былі дапушчаны грубыя скажэньні партыйнае лініі ў справе калгаснага руху. Партыя са ўсёй сілай б'е і будзе біць па гэтых скажэньнях. Тэзісы яшчэ і яшчэ раз папярджваюць, што толькі на аснове поўнага захаваньня прынцыпу добраахвотнасьці, уліку канкрэтнай абстаноўкі, толькі на аснове ўмацаваньня саюзу з серадняком, толькі на аснове рашучай барацьбы супроць антысерадняцкіх перагібаў, супроць тэарэтыкаў «самацёку», толькі на аснове ажыцьцяўленьня палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы, на аснове суцэльнай калектывізацыі і саюзу з серадняком, толькі на аснове аказаньня пераваг калгаснаму руху, які разьвіваецца, мы забясьпечым поўны посьпех сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі.

Вырашэньне збожжавай праблемы дае магчымасьць іншым галінам сельскае гаспадаркі выйсьці з труднасьцяй. Таму зараз адназ з асноўных задач будзе таксама зьяўляцца задача хутчэйшага разьвіцьця жывёлагадоўлі.

У цэлым радзе месц, дзе процант калектывізацыі нізкі (5,6 проц.) многія работнікі апусьцілі рукі і перасталі кампацыцца ад калгасах, перасталі займацца пытаньнямі калгаснага руху. Супроць гэтай замяшанасьці, супроць гэтай недавацэнкі калгаснага руху павінен быць адкрыты моцны агонь. Задача заключаецца ў тым, каб забясьпечыць умацаваньне калгасаў, далейшае разьвіцьце калгаснага руху.

Тэзісы папярэджваюць супроць якога-б ні было ігнараваньня індывідуальнай гаспадаркі. Устанаўленьне правільных адносін да індывідуальнай бядняцка-серадняцкай гаспадаркі палегчыць у далейшым калектывізацыю гэтых гаспадарак. Абвастрэньне ўзаемаадносін паміж калгасьнікамі і індывідуальнікамі зьяўляецца тормазам для далейшай калектывізацыі. Таму з боку калгасаў павінна быць аказана падтрыманьне індывідуальным бядняцка-серадняцкім гаспадаркам.

Там, дзе яшчэ няма масавага калгаснага руху, павінна быць праведзена падрыхтоўчая работа да гэтага руху. Яна павінна выявіцца: у разьвіцьці каапэрацыйных арганізацый, у масавым пашырэньні т-ваў грамадзкай апрацоўкі зямлі, як першапачатковай формы калгасу, пераходнай да арцелі, ва ўсямерным умацаваньні існуючых калгасаў, у насаджэньні саўгасаў, узмацненьні наступленьня на кулака, ва ўзмацненьні арганізацыі беднаты і г. д.

Задача хутчэйшага правядзеньня сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі патрабуе вялізарнейшай работы па ўстанаўленьні тыпаў разьвіцьця для розных раёнаў, па навуковай распрацоўцы цэлага раду праблем, зьвязаных з разьвіцьцём сельскай гаспадаркі, патрабуе ўсямернага ўзмацненьня падрыхтоўкі кадраў.

Задачы, якія вызначаюцца тэзісамі ў галіне разьвіцьця нашай далейшай работы па сацыялістычнай перабудове вёскі, вялізарныя. «На аснове калектывізацыі, разьвіцьця машына - трактарных станцый і арганізацыі саўгасаў НАША ПАРТЫЯ МОЖА ПАЧАЦЬ АЖЫЦЬЦЯЎЛЯЦЬ ЛЁЗУНГ «ДАГНАЦЬ І ПЕРАГНАЦЬ» КАПІТАЛІСТЫЧНЫЯ КРАІНЫ НЯ ТОЛЬКІ Ў АДНОСІНАХ ДА ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ, ДЗЕ ПЕРАВАГІ БУЙНАЕ ГАСПАДАРКІ ЎЖО ДАЎНО ВЫЯЎЛЕНЫ З ВЯЛІЗАРНАЙ СІЛАЙ, АЛЕ І Ў ГАЛІНЕ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ, ТЭМПЫ РАЗЬВІЦЬЦЯ якое да гэтага часу вызначаліся вялізарнай перавагай крайне малапрадукцыйнай дробнай і драбнейшай сельскай гаспадаркі, А ЦЯПЕР БУДУЦЬ ВЫЗНАЧАЦЦА ПАСКОРАНЫМ РАЗЬВІЦЬЦЁМ КАЛГАСАЎ І САЎГАСАЎ, ЯКІЯ ПРАДСТАЎЛЯЮЦЬ САБОЮ НОВЫ ТЫП ГАСПАДАРКІ, нябачаны гісторыяй чалавецтва і ўпяршыню адкрыты практыкай гаспадарчага будаўніцтва ў СССР».

Тэзісы Палітбюро падагульваюць нашу работу па разьвіцьці калгаснага руху, па вырашэньні збожжавай праблемы, па разьвіцьці калгасаў, па забясьпячэньні поўнага правядзеньня генэральнай лініі нашай партыі. Гэтыя тэзісы вызначаюць шляхі далейшага разьвіцьця калгаснага руху. Гэтыя тэзісы павінны быць прапрацаваны ўсімі партыйнымі і камсамольскімі арганізацыямі. Дзелавое абгаварэньне тэзісаў Цэнтральнага Камітэту дапаможа далейшай мабілізацыі мас на справу сацыялістычнага будаўніцтва, дапаможа яшчэ большаму забясьпячэньню поўнага правядзеньня генэральнай лініі нашай партыі.

Наша работа па сацыялістычным будаўніцтве ў вёсцы адбываецца ва ўмовах жорсткай клясавай барацьбы. Кулак жорстка супрацьўляецца нашай рабоце. Трэба мабілізаваць усе сілы для правядзеньня генэральнай лініі нашай партыі, для далейшага разгортваньня калгаснага руху, для забясьпячэньня ліквідацыі кулацтва на аснове суцэльнай калектывізацыі.

Разьвіцьцё калгаснага руху, яго замацаваньне магчыма толькі на аснове жорсткай барацьбы супроць апартуністычных элемэнтаў. Вядучы сыстэматычную і ўпартую барацьбу супроць усіх выглядаў апартунізму ў тэорыі і на практыцы, супроць «левых» загібаў, гэтага асноўнага тормазу калгаснага руху і супроць правага апартунізму—галоўнай небясьпекі, партыя дабіецца поўнай сацыялістычнай перабудовы сялянскай гаспадаркі.

Мінулы пэрыяд разьвіцьця поўнасьцю пацьвердзіў усе намёткі Цэнтральнага Камітэту партыі ў галіне калектывізацыі. Далейшая работа, пад кіраўніцтвам Ленінскага Цэнтральнага Камітэту партыі, забясьпечыць выкананьне і перавыкананьне ўсіх нашых заданьняў.

ПАЗАЧАРГОВЫ СХОД

рабкораў рэдкалегій насьценгазэт і ўсіх працаўнікоў друку

У сераду, 21-га мая, у клюбе друкароў, а 7 гадз. веч., рэдакцыі цэнтральных газэт і ЦБ сэкцыі працаўнікоў друку склікаюць сход рабкораў рэдкалегій насьценных газэт і ўсіх працаўнікоў друку па пытаньні аб спаборніцтве паміж газэтамі, рабкорамі Заходняй вобласьці і друкам і рабкорамі БССР.

У парадку дня: АБГАВАРЭНЬНЕ ДАГАВОРУ АБ САЦСПАБОРНІЦТВЕ З ПРАДСТАЎНІКАМІ ГАЗЭТ І РАБСЕЛЬКОРАЎ ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЬЦІ, ЯКІЯ ПРЫБЫЛІ Ў МЕНСК.

РЭДАКЦЫІ ЦЭНТРАЛЬНЫХ ГАЗЭТ.
ЦБ СЭКЦЫІ ПРАЦАЎНІКОЎ ДРУКУ.

VIII менская акруговая партканфэрэнцыя

Спрэчкі па дакладу тав. Гея аб рабоце ЦК КП(б)Б

19-га мая ранішняе і вячэрняе пасяджэньні партыйнай канфэрэнцыі былі прысьвечаны спрэчкам па дакладу сакратара ЦК КП(б)Б т. Гея аб рабоце Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б. Дэлегаты канфэрэнцыі ў сваіх прамовах спыняліся на асноўных пытаньнях работы Цэнтральнага Камітэту і чарговых задачах, якія стаяць перад партыйнай арганізацыяй.

Тав. Пыжыкаў у сваім выступленьні адзначыў, што палітычная лінія Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б была і ёсьць правільная. Ацэньваючы работу ЦК КП(б)Б прамоўца падкрэсьлівае, што Цэнтральны Камітэт няўхільна праводзіць у жыцьцё генэральную лінію партыі.

Потым т. Пыжыкаў спыняецца на пытаньнях калгаснага будаўніцтва. Ён адзначае, што побач з вялікімі дасягненьнямі ў практыцы калгаснага руху ў асобных мясцох былі дапушчаны грубыя памылкі і скрыўленьні. Мы павінны хутка і рашуча ліквідаваць гэтыя скрыўленьні і выправіць памылкі, дапушчаныя асобнымі арганізацыямі. Разам з гэтым прамоўца падкрэсьлівае, што трэба даваць бязьлітасны адпор усялякім спробам справа і зьлева выкарыстаць меўшыя месца перагібы і памылкі для дыскрэдытацыі бальшавіцкага кіраўніцтва нашай партыі. Палітычная лінія Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б была і ёсьць правільнай.

Тав. Пыжыкаў асабліва падкрэсьліў значэньне праблемы кадраў для калгаснага будаўніцтва.—Мы павінны, заявіў прамоўца, узмацніць работу навучальных устаноў, якія рыхтуюць кадры для сельскай гаспадаркі. У прыватнасьці, т. Пыжыкаў заявіў, што трэба рашуча паляпшыць работу с.-г. акадэміі БССР.

Тав. Кузьняцоў гаварыў аб недахопах у прамысловым будаўніцтве. Ён рад вытворчых непарадкаў, адсутнасьць выразнага кіраўніцтва і арганізацыі працы на радзе прадпрыемстваў прыводзіць да прарываў у выкананьні прамфінпляну. Многія кіраўнічыя органы прамысловасьці (трэсты) невыстарчальна кіруюць работай прадпрыемстваў. Тав. Кузьняцоў падае канкрэтныя факты невыстарчальнага кіраўніцтва з практыкі Лесбелу.

Прамоўца адзначае, што яшчэ далёка ня ўсё зроблена для баявой мабілізацыі рабочых мас на барацьбу за ліквідацыю прарываў і перавыкананьне прамфінпляну. Нізавы фабрычна-заводзкі друк у гэтым напрамку яшчэ працуе слаба. Многія фабрычна-заводзкія газэты несваячасова сыгналізуюць аб прарывах на прадпрыемствах. Частка віны за гэта падае на наш цэнтральны друк, які слаба дапамагае фабрычна-заводзкім шматтыражкам. У заключэньне т. Кузьняцоў падкрэсьлівае, што партыйная арганізацыя павінна мабілізаваць усе свае сілы, каб поўнасьцю ліквідаваць прарывы і забясьпечыць выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну.

Тав. Серпень у пачатку сваёй прамовы канстатуе, што Цэнтральны Камітэт КП(б)Б выразна і цьвёрда ажыцьцяўляе генэральную лінію партыі. Потым прамоўца пераходзіць да пытаньняў калгаснага будаўніцтва. У прыватнасьці т. Серпень гаварыў аб арганізацыйным кіраўніцтве калгасным рухам.

Прамоўца заявіў, што на гэтым адказьнейшым вучастку ёсьць пэўныя недахопы. Калгасцэнтр даваў мясцом шмат дырэктыў і цыркуляраў, але канкрэтнага практычнага жывога кіраўніцтва амаль ня было. Між тым, на пытаньні арганізацыйнага кіраўніцтва калектывізацыяй трэба зьвярнуць сур'ёзную ўвагу. Сыстэму кустоў трэба рэарганізаваць у поўнай адпаведнасьці з мясцовымі ўмовамі і запатрабаваньнямі. Калі куст будзе існаваць толькі на паперы, а калгасы на ўсялякай справе будуць сьдзіць у раён, дык, бясспрэчна, карысьці ад такіх кустоў будзе мала.

Потым т. Серпень гаварыў аб задачах дапамогі індывідуальнаму бядняцка-серадняцкаму сэктару. Калгасы павінны прыйсьці па дапамогу індывідуальным бядняцка-серадняцкім гаспадаркам, павінны дапамагчы ім скончыць веснавую сяўбу. Задача Калгасцэнтру заключаецца ў тым, каб ён выпрацаваў канкрэтныя меры па практычным ажыцьцяўленьні гэтае задачы. Паміж калгасамі і індывідуальным бядняцка-серадняцкім сэктарам павінна існаваць цесная сувязь. Гэта зьяўляецца адным з асноўных сродкаў для ўцягненьня індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у калгасы.

Тав. Ліпоўская гаварыла аб рабоце сярод жанчын. Па гэтым пытаньні ёсьць выразныя дырэктывы Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б. ЦК і АК КП(б)Б ня раз падкрэсьлівалі вялікае палітычнае значэньне работы сярод працоўных жанчын. Між тым, трэба канстатаваць, што ў многіх мясцох дырэктывы ЦК і АК аб разгортваньні выхаваўчай масавай работы сярод асноўных мас сялянак ня выконваюцца. Адсутнасьць работы сярод асноўных мас сялянак толькі на руку кулаку. Кулак разгортвае шалёную агітацыю сярод адсталых пластоў сялянак, нацкоўваючы іх супроць калгасаў. Партыйныя арганізацыі павінны ўзмацніць палітычную работу сярод жанчын. Трэба мабілізаваць асноўныя масы сялянак на барацьбу за калгаснае будаўніцтва, за ліквідацыю кулацтва, як клясы, на аснове суцэльнай калектывізацыі.

Тав. Гутман у сваім выступленьні завастрыў увагу канфэрэнцыі на пытаньнях работы сярод беднаты. Прамоўца адзначыў, што асобныя ячэйкі ігнаруюць гэту карэнную задачу партыі — работу па самастойнай арганізацыі батрацка-бядняцкіх мас. Мы павінны дабіцца злыбокага пералому ў рабоце сярод батрацка-бядняцкіх мас. Трэба ўзмацніць і наладзіць сыстэматычную работу батрацка-бядняцкіх груп калгасаў. У заключэньне т. Гутман гаварыў аб пытаньнях нацыянальнай палітыкі ў калгасным будаўніцтве. У прыватнасьці, т. Гутман завастрыў увагу на рабоце ў інтэрнацыянальных калгасах.

Потым выступілі т.т. Шапіра, Канакоцін, Каткоў, Хэйфец.

***

Перад пачаткам вячэрняга пасяджэньня канфэрэнцыю вітала дэманстрацыя рабочых Фрунзаўскага раёну. Канфэрэнцыя вылучыла дэлегацыю ў складзе т. т. Славінскага, Каменштэйна, Самойлава, Цімашэнкі, Бачарова, Грысэвіча і Зірніса для адказнага прывітаньня рабочай дэманстрацыі. Канфэрэнцыя ў поўным складзе вышла спаткаць дэманстрацыю фрунзаўскіх рабочых.

***

Пасьля дэманстрацыі на канфэрэнцыю зьявіліся шматлікія дэлегацыі ад заводаў і фабрык. Дэлегацыя фабрыкі «Кастрычнік» горача вітала партыйную канфэрэнцыю ад імя 1.500 рабочых і работніц фабрыкі. Тав. Хаіна ад імя рабочых фабрыкі «Кастрычнік» далажыла канфэрэнцыі, што прамфінплян на прадпрыемстве за першае паўгодзьдзе выкананы на 103,27 проц. Сабекошт прадукцыі зьніжан на 12,96 проц. У сацыялістычным спаборніцтве прымаюць удзел амаль ўсе рабочыя. З 1.500 рабочых 1.337 зьяўляюцца ўдарнікамі. У ленінскія дні 200 перадавых рабочых падалі заявы ад прыёме ў партыю.

Ад імя навуковай сэкцыі дактароў партыйную канфэрэнцыю вітаў прафэсар Рубашоў. Ад імя рабочых друкарні імя Сталіна з гарачым прывітаньнем выступіў т. Бэргэр. Тав. Бэргэр далажыў канфэрэнцыі, што друкарня імя Сталіна выканала прамфінплян на 102 проц.

Дэлегацыя рабочых Эльводу рапартавала канфэрэнцыі аб выкананьні прамфінпляну на прадпрыемстве. Дэлегацыя заявіла, што рабочыя Эльводу дабіліся выкананьня прамфінпляну на 113 проц. Тав. Ігнатаў горача вітаў канфэрэнцыю ад імя рабочых шпалернай фабрыкі ім. Варо́ўскага. Тав. Ігнатаў сказаў, што рабочы калектыў фабрыкі імя Варо́ўскага дае падарунак VIII акруговай менскай партканфэрэнцыі — перавыкананьне прамфінпляну.

З вялікім уздымам канфэрэнцыя сустрэла выступленьне т. Міхейчыка, які выступіў з прывітаньнем ад імя калгасу «Новы Шлях» (Астрашыцка-Гарадзецкі раён). Канфэрэнцыю віталі таксама дэлегацыі ад байцоў і камандзіраў № Белдывізіі, ад спэцыялістых сельскай гаспадаркі і г. д.

***

На вячэрнім пасяджэньні ў спрэчках выступілі т.т. Шульман, Ластоўскі і інш.

На партыйных канфэрэнцыях

МАГІЛЕЎ

Адкрылася IX партыйная канфэрэнцыя Магілеўскай гарадзкой арганізацыі. Канфэрэнцыю віталі шматлікія дэлегацыі ад заводаў і фабрык і інжынэрна-тэхнічных работнікаў. З дакладам аб рабоце Магілеўскага акруговага камітэту партыі выступіў сакратар АК КП(б)Б т. Чарнушэвіч.

Дэлегаты ў спрэчках па дакладу акруговага камітэту рашуча патрабавалі ўзмацненьня барацьбы з правым і «левым» апартуністымі, якія перашкаджаюць разгортваньню сацыялістычнага будаўніцтва. Прамоўцы ў сваіх выступленьнях спыняліся на асноўных пытаньнях работы акруговага і гарадзкой партарганізацыі.

Потым канфэрэнцыя заслухала даклад т. Жопудава аб рабоце Магілеўскай АКК КП(б)Б.

У ганаровы прэзыдыум канфэрэнцыі абрала палітбюро ЦК УсеКП(б) і т. т. Арджанікідзэ, Гея, Васілевіча. Гарадзкая партканфэрэнцыя атрымала прывітаньне ад VIII партыйнай канфэрэнцыі Клімавіцкага раёну.

ГОМЕЛЬ

Акруговая партыйная канфэрэнцыя праходзіць пад знакам шырока разгорнутай самакрытыкі. Канфэрэнцыя заслухала і абмеркавала даклад Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б, зроблены т. Галадзедам. Потым канфэрэнцыя абмеркавала даклад т. Капніна аб рабоце ЦКК КП(б)Б і справаздачны даклад Гомельскай АКК.

Канфэрэнцыю віталі дэлегацыі ад камуны імя Леніна, калгасу імя Энгельса, калгасу імя Дзяржынскага і г. д.

МАЗЫР

Акруговая партканфэрэнцыя заслухала даклад т. Чарвякова аб рабоце ЦК КП(б)Б. Па дакладу т. Чарвякова разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі, у якіх прынялі ўдзел звыш 20 дэлегатаў канфэрэнцыі. Усе прамоўцы канстатавалі, што Цэнтральны Камітэт КП(б)Б праводзіў правільную палітычную лінію і няўхільна змагаўся з правым апартунізмам—галоўнай небясьпекай і з «левым» апартунізмам. Канфэрэнцыя паслала прывітальную тэлеграму Цэнтральнаму Камітэту УсеКП(б), т. Сталіну і ЦК КП(б)Б.

З дакладам аб рабоце ЦКК КП(б)Б на акруговай партканфэрэнцыі выступіла т. Прусакова.

Партыйную канфэрэнцыю віталі дэлегацыі ад заводаў, фабрык і г. д. Рабочыя дэлегацыі, спэцыялістыя, прадстаўнікі камсамолу запэўнялі канфэрэнцыю, што яны яшчэ больш мабілізуюць свае сілы, каб дабіцца выкананьня пяцігодкі за 4 гады.

Да VI-ай акруговай партыйнай канфэрэнцыі Магілеўшчыны

Адрэзак часу паміж V і VI-ай партканфэрэнцыямі зьяўляецца адказьнейшым гістарычным этапам у жыцьці і рабоце нашай партыі, усіх яе арганізацый. За гэты прыяд Магілеўская партарганізацыя, як і ўся партыя, пад кіраўніцтвам Ленінскага ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б, пад кіраўніцтвам акругкому мае рад значных дасягненьняў ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва. Асноўнымі момантамі, галоўнымі, прыцыпова - палітычнымі пытаньнямі, якія займалі ўвагу АК і ўсёй партарганізацыі, была перш за ўсё барацьба за генэральную лінію нашай партыі, барацьба з права-апартуністычным ухілам, як больш небясьпечным на даным этапе, барацьба з прымірэнчымі да яго адносінамі, з «левымі» загібамі, якія льлюць ваду на млын правага апартунізму, фактычна дапамагаюць правым ухілістым. У справе барацьбы з ухіламі Магілеўская арганізацыя, як і ўся КП(б)Б, мае значныя посьпехі. Уся арганізацыя, асноўныя масы рабочае клясы правільна ўяснілі, рашуча асудзілі апартуністычную, антыленінскую сутнасьць права-ўхілісцкай ідэалёгіі. Магілеўская арганізацыя разам з усёй КП(б)Б, пад кіраўніцтвам яе Ленінскага ЦК, правяла значную работу па барацьбе са скрыўленьнямі клясавай лініі, па барацьбе з кулацкай палітыкай у органах Наркамзему, Наркамасьветы, на барацьбе з нацыянал-дэмакратычнымі скрыўленьнямі ў галіне нацпалітыкі. Аднак, і ў сучасны момант, асабліва ў сувязі з памылкамі і асобнымі прарывамі ў справе калектывізацыі, сям-там маюць месца яўна апартуністычныя выступленьні. Сёй-той дагаварваецца і да таго, што «раз «левыя» загібы зьяўляюцца галоўным тормазам у справе калектывізацыі, значыць, правы ўхіл ня ёсьць ужо галоўная небясьпека». Канфэрэнцыя павінна з усёй рашучасьцю асудзіць гэтыя права-апартуністычныя, блытаныя, палітычна шкодныя разважаньні. Ва ўмовах шпаркага разгортваньня сацыялістычнага будаўніцтва, рашучага наступленьня на капіталістычныя элемэнты, ліквідацыі кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі, галоўнай небясьпекай застаецца небясьпека права-апартуністычных хістаньняў і ўхілаў. Скарыстоўваючы памылкі і прарывы ў рабоце асобных арганізацый, правыя апартуністы аб'ектыўна абярнуліся ў кулацкую агентуру ўнутры партыі, імкнуцца апаганіць правільнасьць генэральнай лініі нашай партыі, цягнуць партыю назад да згортваньня тэмпаў індустрыялізацыі, да фактычнага адмаўленьня ад калектывізацыі сельскае гаспадаркі. Парткнфэрэнцыя павінна мабілізаваць увагу партарганізацыі на выкрыцьцё, зьнішчэньне ўсякіх спроб прадставіць барацьбу з памылкамі, перагібамі, як «адступленьне» ад лініі партыі ў справе калектывізацыі, а таксама—і ўсякіх спроб аслабіць барацьбу з кулаком, апусьціць рукі перад труднасьцямі. Арганізацыяй павінен быць дан рашучы адпор усякім апартуністычным наскокам, накіраваным да дыскрэдытацыі генэральнай лініі нашай партыі, дыскрэдытацыі партыйнага кіраўніцтва.

У справе разьвіцьця прамысловасьці мы дасягнулі значных посьпехаў. Вынікі работы прамысловасьці за гэты прыяд, размах капітальнага будаўніцтва сьведчаць аб перавыкананьні пяцігодкі, аб практычным ажыцьцяўленьні лёзунгу «пяцігодку—за чатыры гады». Прамфінплян за першае паўгодзьдзе 29-30 г. у сярэднім па акрузе па выпуску валавой прадукцыі, па прадукцыйнасьці працы, па зьніжэньні сабекошту выкананы з некаторым перавышэньнем. Гэтыя вынікі зьявіліся магчымымі, дзякуючы вялікай палітычнай актыўнасьці рабочых мас, дзякуючы значна разгорнутаму сацспаборніцтву і ўдарніцтву на прадпрыемствах. Аднак, у рабоце прамысловасьці назіраецца рад адмоўных момантаў. Некаторыя прадпрыемствы значна недавыканалі прамфінплян, вытворчая дысцыпліна на многіх прадпрыемствах—не на належнай вышыні. Другі квартал дае агульны рост прагулаў, ганебна адстае якасьць прадукцыі. Канфэрэнцыя павінна зьвярнуць увагу партыйных, прафэсыянальных і гаспадарчых арганізацый на падцягваньне адсталых прадпрыемстваў, на выкананьне ўсіх паказальнікаў (асабліва якасных) прамфінпляну, на барацьбу за вытворчую дысцыпліну, за якасьць прадукцыі, на рашучае ўзмацненьне кіраўніцтва гаспадарчай работай з боку мясцовых партыйных і прафсаюзных арганізацый.

Праводзячы работу па ажыцьцяўленьні генэральнай лініі нашай партыі, асудзіўшы дапушчаныя памылкі, энэргічна іх выпраўляючы, партарганізацыя Магілеўшчыны за справаздачны пэрыяд дабілася значных посьпехаў ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва.

Партарганізацыя Магілеўшчыны да VI акруговай партканфэрэнцыі падыходзіць вырасшай (за гэты пэрыяд прынята ў партыю 1.382 чал., удзельная вага рабочых павялічылася з 48,3 проц. да 55,7 проц.), ідэалёгічна вытрыманай, бальшавіцка стойкай, здольнай змагацца за генэральную лінію партыі.

А. ЧАРНУШЭВІЧ.

ЦК УсеКП(б)

VIII Менская партыйная акруговая канфэрэнцыя КП(б)Б шле сваё палкае бальшавіцкае прывітаньне штабу Ленінскай Камуністычнай партыі — ЦК УсеКП(б).

УсеКП(б), пад выпрабаваным кіраўніцтвам ЦК, вяла непрымірымую барацьбу за генэральную лінію партыі, супроць правага ўхілу, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, «левых» загібаў, рэштак контр-рэвалюцыйнага трацкізму, а таксама з прымірэнчымі адносінамі да іх. Партыя і яе ленінскі ЦК вядзе гіганцкую работу па ператварэньні СССР з краю эканамічна і тэхнічна адсталага, малакультурнага, у край шпарка ўзрастаючага сацыялізму. Партыя, змагаючыся за тэмпы індустрыялізацыі краю, з посьпехам вядзе рабочую клясу да выкананьня задачы «дагнаць і перагнаць у эканамічных і тэхнічных адносінах перадавыя капіталістычныя краі».

Рабочая кляса, пад кіраўніцтвам партыі, апіраючыся на батрацка-бядняцкія масы, у цесным саюзе з серадняком, вядзе работу па перабудове дробных і найдрабнейшых бядняцка-серадняцкіх індывідуальных гаспадарак, вядзе работу па калектывізацыі сельскае гаспадаркі. Посьпехі калектывізацыі забясьпечылі магчымасьць замены вытворчасьці кулацкіх гаспадарак вытворчасьцю калгасаў і саўгасаў і стварылі ўмовы для пераходу ад палітыкі абмежаваньня да палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы, на аснове суцэльнай калектывізацыі.

Апіраючыся на беднату і батрацтва, праводзячы ў жыцьцё ленінскія наказы аб узмацненьні саюзу з серадняком, партыя, пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК, вяла і будзе весьці рашучую барацьбу супроць тых, хто імкнецца парушыць гэтыя наказы, хто скажае лінію партыі ў адносінах да серадняка.

Менская арганізацыя КП(б)Б, пад бальшавіцкім кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б, дабілася значных посьпехаў у справе сацыялістычнай рэканструкцыі народнае гаспадаркі. Менская арганізацыя на аснове бальшавіцкай самакрытыкі рашуча выпраўляе памылкі і перагібы, якія мелі месца ў справе калектывізацыі.

Рашуча змагаючыся з усякімі ўхіламі ад генэральнай лініі партыі, Менская арганізацыя КП(б)Б нанесла руйнуючы ўдар нацыянал-апартунізму ў нашых кадрах і контр-рэвалюцыйнаму нацыянал-дэмакратызму—агентуры нацыянал-фашызму і падышла да сваёй VIII канфэрэнцыі маналітнай, згуртаванай навукола ленінскага ЦК.

VIII Менская партыйная канфэрэнцыя запэўняе ЦК УсеКП(б), што ўсе сілы акруговай партарганізацыі, уся энэргія рабочае клясы і батрацка-бядняцкіх і серадняцкіх мас і ў далейшым будуць накіраваны на барацьбу пад кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады, за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, за далейшае разьвіцьцё калгаснага будаўніцтва, за правядзеньне ў жыцьцё ленінскай нацыянальнай, за ўзмацненьне абароназдольнасьці нашага краю, на далейшую непрымірымую барацьбу з правым ухілам, з нацыянал-апартунізмам і шавінізмамі ўсіх колераў, з «левымі» загібамі і прымірэнцтвам да іх.

Няхай жыве ЦК УсеКП(б)—штаб ленінскай бальшавіцкай партыі!

Няхай жыве выпрабаваны спадарожнік Леніна—тав. Сталін!

ЦК КП(б)Б

Цэнтральнаму Камітэту Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі ад VIII Менскай акруговай партканфэрэнцыі гарачае бальшавіцкае прывітаньне.

Партыя пад цьвёрдым кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б прыходзіць да XIII зьезду згуртаванай вакол барацьбы за генэраль

Лепшы падарунак XIII зьезду КП(б)Б — выканаць і перавыканаць прамфінплян, палепшыць якасьць прадукцыі, скончыць сяўбу яравых, пашырыўшы плошчу тэхнічных і іншых культур

Партарганізацыі гораду і вёскі, прафсаюзы, ударнікі—як вы рыхтуецеся да партыйнага зьезду

НА 15 МАЯ У БССР ЗАСЕЯНА 950,567 ГА—40,8 ПРОЦ. ПЛЯНУ

Калгасы ўсё яшчэ адстаюць з сяўбою тэхнічных культур

Выканаўшыя пасеўны плян калгасы, арганізуйце дапамогу адстаўшым калектывам і маламоцным індывідуальнікам!

АПЭРАЦЫЙНАЯ ЗВОДКА

Паводле даных Наркамзему, на 15 мая па БССР засеяна 950.567 гэкт., што складае 40,8% агульнага пасеўнага пляну. Калгасамі засеяна 195.057 гэкт.—45% пляну, індывідуальным сэктарам—755.510 гэкт. — 39,8%.

На асобных культурах плян выкананы наступным чынам: па збожжавых культурах—калгасамі на 52,3%, індывід. сэктарам—на 40,1%; па тэхнічных культурах: калгасамі — на 16,2%, індывід. сэктарам—на 21,3%; па бульбе: калгасамі — на 34,8%, індыв. сэктарам — на 52%; па аднагадовых травах (віцы і сэрадэлі): калгасамі — на 46,4%, індыв. сэктарам — на 32,6%; па канюшыне: калгасамі—на 64,6%, індыв. сэктарам—на 47,7% і на іншых культурах: калгасамі—на 26,6%, індыв. сэктарам—на 25,5%.

У сярэднім па абодвых сэктарах плян выкананы: па збожжавых культурах—па 42,2%, па тэхнічных культурах—па 20,5%, бульбе—на 48,9%, аднагадовых травах — на 35,8%, канюшыне — на 53,1% і іншых культурах — на 23,4%.

На асобных акругах малюнак такі:

У Менскай акрузе плян выкананы ў калгасах на 48,3%, у індыв. сэктары — на 41,1% і ў сярэднім **па абодвых сэктарох — на 42,7%; у Магілеўскай акрузе:** у калгасах на 41,8%, індыв. сэктары — на 50,6%, **у сярэднім—на 48,9%; у Бабруйскай акрузе:** у калгасах — на 46,5%, індыв. сэктары — на 45,1%, **у сярэднім—на 45,3%; у Гомельскай акрузе:** у калгасах — на 62%, індыв. сэктары — на 50,8%, **у сярэднім—на 52,9%; у Мазырскай акрузе:** у калгасах — на 64%, індыв. сэктары—на 59,5%, **у сярэднім — на 60,5%; у Аршанскай акрузе:** у калгасах — на 32,2%, індыв. сэктары—на 30,3%, **у сярэднім —на 30,6%; у Віцебскай акрузе:** у калгасах — на 27,2%, індыв. сэктары — на 11,3%, **у сярэднім — на 13,7%; па Полацкай акрузе:** у калгасах — на 37,3%, індыв. сэктары—на 25,2%, **у сярэднім — на 27,7%.**

На апошнім месцы, такім чынам, Віцебская акруга.

У тэмпе сяўбы тэхнічных культур і бульбы калгасы ўсё яшчэ адстаюць ад індывідуальнага сэктару. Так, у Магілеўскай акрузе па тэхнічных культурах індывідуальным сэктарам плян выкананы на 25,8%, а калгасамі — на 19,7%; па бульбе: індыв. сэктарам — на 77,4%, а калгасамі—на 39,4%.

У Менскай акрузе па тэхнічных культурах індывідуальным сэктарам плян выкананы па 25,4%, а калгасамі — на 10%; па бульбе: індыв. сэктарам — на 48,1%, калгасамі — на 43,1%. Той самы малюнак і па іншых акругах.

СКОНЧЫЛІ СЯЎБУ, ПЕРАВЫСІЛІ ПЛЯНЫ

СЛУЦАК. (Наш кар.). Усё новыя і новыя калгасы ўключаюцца ў лік скончыўшых сяўбу. Сьледам за калгасамі «Чырвоны Маяк» і «Колас» скончылі палявыя работы такія буйныя калгасы раёну, як «Вольная Праца», імя Карла Маркса, «КІМ» і інш.

Некаторыя калгасы перавысілі пасеўныя пляны. Так, камсамольскі калгас «КІМ» перавысіў плянавае меркаваньне на 22 гэктары. Кімаўцы працавалі ударна, на працягу месяца зусім ня мелі выхадных дзён.

З посьпехам праведзеная сяўба ў калгасах зьявілася найлепшым сродкам агітацыі за калектывізацыю. У калгасы пачалі ўступаць новыя беднякі і сераднякі-індывідуальнікі. Гэтымі днямі ў калгас імя Карла Маркса паданы 4 заявы, а ў калгас імя Розы Люксэмбург уступіла 7 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, якія адразу-ж перадалі калгасу рабочую жывёлу і сродкі вытворчасьці.

Аднак, ёсьць рад і такіх калгасаў, дзе ў сувязі з дрэннай арганізацыяй працы, адсутнасьцю працоўнай дысцыпліны, сяўба зацягваецца. Такім калгасам зьяўляецца «Чырвоная Зорка». У гэтым калгасе на работу выходзяць у 12 гадзін дня, даюць вельмі нязначную прадукцыйнасьць працы.

КАРАЧУН.

31,5 ПРОЦ.

На 10 мая па БССР плянавае заданьне па кантрактацыі пасеваў выканана на 31,5 проц.

Усяго па абодвых сэктарох заключана дагавароў: па жыце—на 190.114 гэкт., што складае 25 проц. пляну, па іншых збожжавых культурах—на 185.185 гэкт. (35 проц.), па ільну-валакне—на 29.476 гэкт. (29 проц.), канаплях—на 1.589 гэкт. (32 проц.), канюшыне—на 6.359 гэкт. (21 проц.), віцы—на 8,385 гэкт. (19 проц.), лубіне—на 6.745 гэкт. (17 проц.), сэрадэлі—на 1.356 (18 проц.), бульбе—на 52.567 гэкт. (62 проц.).

Асабліва дрэнна ідзе кантрактацыя па Магілеўскай акрузе. Так, на жыце плян выканан тут на 8 проц., ільне—на 11 проц., лубіне—на 8 проц. і г. д.

Па індывідуальным сэктары кантрактацыя разгорнута зусім слаба. З агульнай закантрактаванай плошчы, на індывідуальны сэктар прыпадае: па жыце—49,7 проц., па іншых збожжавых культурах— 28,8 проц., ільну-валакне—32,4 проц., канаплях—20,4 проц., канюшыне —17,5 проц., віцы—14,1 проц., лубіне—23,5 проц., сэрадэлі—10,6 проц., бульбе —24,6 проц.

Асноўная маса заключаных дагавароў па кантрактацыі прыпадае на калгасы.

Дапамагаюць індывідуальнікам

Калгасы «Чырвоны Асьветнік», «Культура» і «Чырвоны Сад» Ракцянскага сельсавету, Горацкага раёну, з посьпехам праводзяць сяўбу. Ужо засеялі пшаніцу, віку, авёс і г. д. Калгасьнікі «Чырвонага Саду» выклікалі на сацыялістычнае спаборніцтва ўсе іншыя калгасы Ракцянскага сельсавету. На сваім сходзе яны пастанавілі дапамагчы маламоцным і бясконным індывідуальным гаспадаркам. Гэту пастанову яны праводзяць зараз у жыцьцё.

У 10 ВЕСКАХ КАНТРАКТАЦЫЯ НЕ ПРАВЕДЗЕНА

Бягомль, Меншчына

Ня гледзячы на рад дырэктыў, кантрактацыя пасеваў па Бягомльскім сельсавеце праваліваецца. Толькі з трыма вёскамі заключаны дагавары. У 10 вёсках кантрактацыя не праведзена.

Прадстаўнік парт'ячэйкі Вароніч, які быў накіраваны ў вёску на праведзеньне кантрактацыі, зрабіў даклад... аб міжнародным становішчы і па гэтым спыніўся. Райпаляводсаюз таксама нічога ня робіць, нібыта яго кантрактацыя не датычыць.

Б—а.

Чаму ў Лоеве і Ветрыне не змаглі скарыстаць замежных сявярак?

У Ветрынскі раён, Полацкае акругі, нядаўна былі завезены 4 замежныя тукавыя сявяркі. Загадчык складу райкалгасаюзу, ня ведаючы канструкцыі гэтых машын, радасна прыняў іх, спадзяючыся, што хутка іх зможа скарыстарць. Такія-ж сявяркі былі накіраваны і ў Лоеўскі раён, Гомельшчыны, дзе іх таксама прынялі з вялікай радасьцю.

Калі-ж у Ветрыне пачалі зборку гэтых машын, то выявілася, што ўсе калёсы — левыя, правых няма. Яны памылкова былі перасланы ў Лоеўскі раён. Не хапае і шасьцярэнак.

Такое становішча было і ў Лоеўскім раёне, дзе таксама не хапае частак, якія памылкова былі заслены ў Ветрынскі раён.

Так, у Лоеўшчыне і ў Ветрыншчыне не маглі скарыстаць замежных машын, на якія было затрачана ня мала грошай.

Ветрынскаму райкалгасаюзу былі так сама прысланы сялянскія хады, але надта цяжкія і без пярэдніх падушак.

ЖУК.

Калгасы, рыхтуйцеся да ўборкі ўраджаю!

Ня прыходзіцца даказваць, што ўжо час пачаць падрыхтоўку да ўборачнай кампаніі ў калгасах.

У першую чаргу трэба забясьпечыць іх адпаведнымі рабочымі плянамі, якія павінны быць складзены не пазьней 15 чэрвеня. Да складаньня рабочых пляноў і падрыхтоўкі калгасаў да ўборкі ўраджаю павінна быць прыцягнута ўся агранамія, якая працуе ў раёнах і саўгасах. Трэба пляны работ абгаварыць і прапрацаваць на шырокіх нарадах калгасьнікаў. На аснове практыкі работы па веснавой сяўбе калгасы павінны як найлепш арганізаваць працу, каб забясьпечыць поўнае і своячасовае правядзеньне ўборкі ўраджаю.

Трэба зараз-жа прыступіць да складаньня рабочых брыгад па доглядзе за пасевамі.

Саветы калгасаў павінны сумесна з сельсаветамі заняцца выяўленьнем і ўлікам плошчаў азімых пасеваў былых кулацкіх гаспадарак.

Калгасам трэба абмеркаваць пытаньне аб арганізацыі ясель і пляцовак на час уборачнай кампаніі, што дасьць магчымасьць цалкам скарыстаць працу жанчын - калгасьніц. Усе падросткі павінны быць прымацаваны да адпаведных работ на час уборкі.

Калгасам трэба разгарнуць працу па заключэньні паміж сабою дагавораў аб сацспаборніцтве, якія павінны прадугледзець тэрміны выкананьня работ, пастаноўку лепшай арганізацыі працы, пераход на зьдзельшчыну, лепшае скарыстаньне ўборачных машын і г. д.

Адпаведныя органы павінны прыняць усе крокі, каб своячасова забясьпечыць калгасы патрэбнай колькасьцю ўборачных машын, запасных частак і матар'ялаў. Калгасы-ж разгортваюць на месцы рамонт уборачнага інвэнтару і перавозачных сродкаў.

Работа па ўборачных машынах, як правіла, павінна выконвацца спрактыкаванымі асобамі з ліку членаў калгасу.

Неабходна наладзіць сталы ўлік сабранага ўраджаю, што дапаможа скласьці кармавы балянс і весьці разрахункі ў гаспадарцы.

Калгасам трэба таксама вырашыць пытаньне аб парадку ўборкі ўраджаю неабагуленых пасеваў калгасьнікаў, абгаварыўшы гэта пытаньне на агульным сходзе калгасьнікаў. У тых выпадках, калі вырашана будзе гэтыя пасевы ўбіраць сродкамі калгасаў, неабходна даныя работы ўключыць у агульны рабочы плян калгасу. У тым выпадку, калі ўборка неабагуленых пасеваў будзе праводзіцца сіламі саміх калгасьнікаў - пасеўшчыкаў у рабочым пляне павінна быць прадугледжана чарговасьць і парадак прадастаўленьня паасобным членам патрэбных машын і цягавай сілы.

Уборачная кампанія — справа вялікай палітычнай важнасьці. На яе правядзеньне павінны быць накіраваны ўсе нашы сілы і сродкі.

ЗАЛЕСКІ.

Давядзем прамфінплян да варштату

Прафсаюзы, ІТР, камсамол—неадкладна ўключайцеся ў падрыхтоўку да налёту

Праз тры дні—23, 24 і 25 мая ў нас (як і ва ўсім Саюзе) будзе праведзены сіламі атрадаў «лёгкай кавалерыі» з удзелам ударнікаў, рацыяналізатараў і самаправераччых брыгад Усебеларускі налёт на прадпрыемствы, з мэтай праверкі давядзеньня прамфінпляну да цэху, брыгады, агрэгату і паасобнага рабочага.

Гэты налёт можа даць нам станоўчыя вынікі толькі ў тым выпадку, калі да яго сапраўды будзе прыцягнута ЎСЯ ГРАМАДЗКАСЬЦЬ ЗАВОДАЎ І ФАБРЫК.

Налёт павінен будзе ня толькі зафіксаваць тое становішча, якое мы маем зараз на прадпрыемствах, але і ПАДШТУРХНУЦЬ САНЛІВЫХ, выявіць канкрэтныя прычыны і вінаватых у зрыве ажыцьцяўленьня гэтай важнай дырэктывы (там, дзе гэта мае месца). Вынікі налёту павінны будуць паказаць як зьнішчыць выяўленыя недахопы.

Налёт павінен будзе падагуліць ЛЕПШУЮ ПРАКТЫКУ ПРАВЯДЗЕНЬНЯ ГЭТАГА МЕРАПРЫЕМСТВА У ЖЫЦЬЦЁ. Гэта асабліва важна таму, што тыя матар'ялы, якія мы маем гаварыць нам аб тым, што давядзеньне прамфінпляну да варштату праводзілася вельмі часта па-саматужнаму, без належнага кіраўніцтва і дапамогі з боку кіруючых гаспадарчых і прафсаюзных арганізацый.

У Ленінградзе для давядзеньня прамфінпляну да варштату абвясьціла сябе мабілізаванай УСЯ ЛЕНІНГРАДЗКАЯ ІТС. У Беларусі практыка Ленінградкай ІТС НЯ БЫЛА ПАДХОПЛЕНА НАШЫМІ ІНЖЫНЭРНА-ТЭХНІЧНЫМІ СІЛАМІ.

Налёт павінен палажыць канец нікіняўважлівым адносінам да правядзеньня ў жыцьцё дырэктыў ВСНГ і ЎсеЦСПС.

Якасьць правядзеньня налёту залежаць на многа і ад таго, наколькі ўдзельнікі яго будуць добра праінструктаваны і зразумеюць сваю задачу. Гэта частка работы ўскладаецца на спэцыяльных кансультантаў, якіх акруговыя штабы павінны мабілізаваць і прыцягваць да кожнага прадпрыемства.

Каб дапамагчы у гэтай рабоце ўдзам «лёгкай кавалерыі», фабзавуцкіх арганізацыі не павінны чакаць дня налёту, а зараз-жа ўзяцца за падрыхтоўку адпаведных матар'ялаў, якія будуць патрэбны ў часе налёту.

Фабзаводзкія газэты і рабкоры павінны неадкладна ўключыцца ў налёт, максімум дапамагчы «лёгкай кавалерыі» ў яе рабоце, шырока асьвятліць ход і вынікі налёту ў фабзаводзкіх газэтах і «ЗЬВЯЗЬДЗЕ».

ЧАСУ ЗАСТАЛОСЯ МАЛА. Акруговыя і фабзаводзкія арганізацыі павінны, скарыстаўшы надрукаваную ніжэй ПАМЯТКУ штаба кіраўніцтва, зараз-жа НЕ ТРАЦЯЧЫ НІ АДНАЕ ХВІЛІНЫ, прыступіць да работы.

Спадзяемся, што прафсаюзы, камсамол, лёгкая кавалерыя і ўся грамадзкасьць Беларусі пакажуць узор работы і ў значаны тэрмін выканаюць гэтае важнае заданьне.

ПАМЯТКА

па правядзеньні налёту на прадпрыемствы Беларусі з мэтай праверкі давядзеньня прамфінпляну да варштату

1) Паводле дырэктывы ЦКК-НК РСІ, ЎсеЦСПС і ЦК ЎсеЛКСМ — 23, 24 і 25 мая павінен быць праведзены адначасовы Ўсебеларускі налёт «лёгкай кавалерыі» на ўсе прадпрыемствы па праверцы выкананьня заданьняў ВСНГ і ЎсеЦСПС аб давядзеньні прамфінпляну да цэху, брыгады, агрэгату і паасобнага рабочага.

Налёт праводзіцца атрадамі «лёгкай кавалерыі» з удзелам ударнікаў, рацыяналізатараў і самаправераччых брыгад. Гэту работу правесьці разам з арганізаванымі ЧКК па самаправерцы.

Трэба праверыць:

Ці маюць цэхі прамфінпляны, у якіх і па якіх прычынах іх няма.

Ці даны вытворчыя заданьні і паказчыкі брыгадам, агрэгатам і варштатам у паасобных зьменах і на які пэрыяд (месяц, дэкаду, пяцідзёнку, дзень).

Ці арганізаваны ўлік работы цэху, брыгады агрэгату і варштату, па якіх пэрыядах і паказчыках вядзецца ўлік.

Як арганізавана інфармацыя рабочых аб выніках работы (памесячна, падэкадна і г. д.).

Як прыцягнуты рабочыя да раскладкі прамфінпляну па цэхах і ўнутры цэху.

2) Для кіраўніцтва і падвядзеньня вынікаў у акругах неадкладна складаюцца штабы з прадстаўнікоў: АКК-РСІ, АПБ, АК ЛКСМБ і рэдакцыі акруговай газэты.

3) Для дапамогі і кансультацыі ў правядзеньні налёту непасрэдна на прадпрыемствах акруговыя штабы кіраўніцтва мабілізуюць патрэбную колькасьць адпаведных працаўнікоў (ІТС, працаўнікоў РСІ і прафапарату, АРУ, партыйных і камсамольскіх работнікаў).

4) Перад пачаткам налёту правесьці інструкцыйныя нарады старшынь груп «ЛК», старшынь вытворчых нарад і прымацаваных да прадпрыемстваў кансультантаў, пасьля чаго на кожным прадпрыемстве паасобку праводзяцца інструкцыйныя нарады ўсіх удзельнікаў налёту.

5) Удзельнікі налёту разьбіваюцца на групы, выходзячы з колькасьці цэхаў, зьмен і агрэгатаў.

6) Пры правядзеньні налётаў абавязкова скарыстоўваюцца на гэтым пытаньні матар'ялы і вынікі самаправерак. спаборніцтва.

7) Скарыстаць сходы рабочых і ўдзеньня перапынкі для шырокага тлумачэньня сутнасьці і значэньня налёту і прыцягненьня да яго шырокіх мас рабочых.

8) Прыцягнуць да актыўнага ўдзелу ў налёце фабзаводзкія газэты і рабкораў.

9) Удзельнікі налёту павінны скласьці усе матар'ялы па гэтым пытаньні ў адміністрацыі і фабзаўкоме, праверыць, ці вывешаны вытворчыя заданьні па цэхах і ля варштатаў і колькі з імі знаёмы кожны рабочы.

10) Удзельнікі налёту павінны праверыць якасьць і ўвязку даведзеньня прамфінпляну да варштату.

11) Налёт канчаецца на прадпрыемствах не пазьней 25 мая, пасьля чаго складаюцца вынікі, у якіх павінна быць падрабязна адказана на ўсе запытаньні праграмы і паказаны канкрэтныя прапановы для зьнішчэньня выяўленых недахопаў. Вынікі павінны быць прастаўлены ў акруговыя штабы кіраўніцтва не пазьней 26 мая.

12) У выпадку недавядзеньня прамфінпляну да цэхаў, агрэгатаў і рабочага варштату вывіць, пры чым дапамогі адміністрацыяй па гэтым пытаньні, высьветліць разам з прычынамі прычыны канкрэтных вінаватых у невыкананьні дырэктыў ВСНГ і ЎсеЦСПС, паставіць пытаньне перад органамі РСІ аб прыцягненьні іх да адказнасьці.

13) Зводныя весткі аб выніках работы акруговыя штабы высылаюць у ЦСПС не пазьней 28 мая тэрміновую поштай.

ШТАБ КІРАЎНІЦТВА ЎСЕБЕЛАРУСКАГА НАЛЁТУ

СЕНЬНЯ

у памяшканьні ЦКК-НК РСІ, а 6 гадзіне веч.,

адбудзецца агульна-гарадзкая НАРАДА СТАРШЫНЬ ГРУП «ЛЁГКАЙ КАВАЛЕРЫІ», СТАРШЫНЬ ВЫТВОРЧЫХ НАРАД І ПРЫМАЦАВАНЫХ ДА ПРАДПРЫЕМСТВАЎ КАНСУЛЬТАНТАЎ

ПА ПЫТАНЬНІ

правядзеньня „налёту" на менскія прадпрыемствы з мэтаю праверкі давядзеньня прамфінпляну да варштату.

На нараду таксама запрашаюцца рабкоры цэнтральных і фабзаводзкіх газэт.

Штаб кіраўніцтва Ўсебеларускага «Налёту».

ЛЕТА—НА СЛУЖБУ АБАРОНЕ

Мы маем такія асоавіяхімаўскія ячэйкі, якія ня могуць пахваліцца добрай работай у зімовых умовах і звычайна ў такіх ячэйках улетку работа зусім замірае.

Асабліва гэта наглядаецца ў вясковых ячэйках, якія апраўдваюцца палявымі работамі, занятасьцю ўсіх членаў ячэйкі і г. д.

Але гэта не апраўданьне. Наадварот, у гэтых умовах трэба умець наладзіць работу і адсутнасьць яе гаворыць аб тым, што нашы вясковыя ячэйкі ня гібкія, ня могуць прыстасавацца да абстаноўкі, да ўмоў, ня могуць выкарыстаць належным чынам даных умоў для справы.

Зусім зразумела, што зімовыя формы работы ў летні час няпрыдатны, што патрэбны новыя формы работы, трэба перабудоўвацца, прыстасоўвацца.

Ёсьць такія ячэйкі, якія вельмі добра выкарыстоўваюць летнія ўмовы. Яны ў самы гарачы час работы ў полі паладжваюць у часе кароткага адпачынку гутаркі па ваенныя тэмы, спаборніцтвы па страляньні, ваянізаваныя гульні і г. д.

У больш вольны час можна правесьці тактычныя заняткі ў полі, ваянізаваны паход і экскурсіі.

Трэба намеціць плян сваёй работы і накіраваць усе свае сілы на тое, каб гэты плян выканаць. Трэба сапраўдна перанесьці сваю работу ў поле, у аўстаноўку, якая-б больш пагадзілася баявую.

У першую чаргу трэба стварыць моцнае асоавіяхімаўскае ядро ў калгасах і саўгасах, аказаць ім дапамогу ў іх рабоце, арганізаваць паказальныя вучасткі і г. д.

У гарадзе асоавіяхімаўскія ячэйкі павінны больш цесна зьвязацца з вайсковымі часьцямі, пры іх дапамозе праводзіць страляньне, тактычныя заняткі і ваенізаваныя паходы, і яшчэ іх задачай зьяўляецца аказваць дапамогу падшэфным вясковым ячэйкам паладжваць сумесныя заняткі, страляньне і г. д.

Лета мы павінны поўнасьцю выкарыстаць і прыстасаваць формы сваёй работы так, каб мець больш выпікаў у ваянізацыі членаў Асоавіяхіму і працоўнага насельніцтва.

Н. С.

Папяровае кіраўніцтва

Кепскае кіраўніцтва, кепская і работа. Так стаіць справа ў асоавіяхімаўскай арганізацыі Лупалаўскага раёну. Райсавет дрэнна кіруе, а ячэйкі на мясцох дрэнна працуюць.

Кіраўніцтва з боку райсавету пастаўлена слаба. Папяровае кіраўніцтва ёсьць, але і яно надзвычай дрэннае, а пра жывое і гаварыць няма чаго.

Райсавет і ячэйкі нядбайна адносяцца да праходзячай міжзборавай работы і падрыхтоўкі актыву з ліку пераменьнікаў і членаў Асоавіяхіму.

Дрэнна ўвязваецца работа ячэек з арганізаванымі вайсковымі куткамі, яны лічаць, што работу будзе весьці вайсковы куток, а іх гэта справа не датычыць.

Адсутнічае і выхаваўчая работа ў ячэйках. Часта можна наглядаць такое становішча, калі кіруючы склад ячэйкі, з прычыны адсутнасьці выхаваўчай работы з актывам і адсутнасьці кіраўніцтва з боку раённага савету, ня ведае нават падарку ўзаемаадносін з хатай-чытальняй і вайсковым кутком.

Гурткі вайсковых ведаў ва многіх мясцох яшчэ і да гэтага часу не арганізаваны, а калі арганізаваны, дык толькі на паперы і не працуюць.

Адсутнічае таксама работа ячэек і з пераменьнікамі. Гэта забыты вучастак работы ячэек. Апошнія ня ўцягваюцца ў практычную работу. Адсутнічае нават сыстэматычная работа і са сваімі членамі ячэйкі.

Часта дрэнна адносяцца да гэтай важнай работы партыйныя і камсамольскія ячэйкі. Возьмем для прыкладу Чэрвеньскую партыйную ячэйку. Яна работай асоавіяхімаўскай ячэйкі ня кіруе і не патрабуе адказнасьці за гэту работу ад работнікаў, што ёю кіруюць.

Такое становішча і ў Сухараўскай партыйнай ячэйцы. Апошняя міжзборная работай і наогул ваянізацыя насельніцтва зусім ня цікавіцца, не зварачае ніякай увагі і камсамольская ячэйка.

Кепска пастаўлена вайсковая работа і ў калгасах, нават ня ўсюды арганізаваны ячэйкі Асоавіяхіму. Райсавет не арганізаваў грамадзкай думкі на лепшае разгортваньне вайсковай работы ў калгасах, не правяў ініцыятывы ў гэтым пытаньні.

А. С.

дарчае будаўніцтва, перш за ўсё індустрыялізацыя, стаяла і стаіць перад партыяй, як цэнтральная і важнейшая праблема. Абарненьне БССР з краіны гаспадарча адсталай, з краіны «балот і лясоў»—у край калгасна-саўгасна-індустрыяльны зьяўляецца тэй асноўнай генэральнай лініяй, па якой ідзе і павінна ісьці работа нашай арганізацыі і мабілізацыя вакол яе шырокіх працоўных мас.

У абсягу разьвіцьця індустрыялізацыі, партыі прыходзілася і прыходзіцца змагацца з тэндэнцыямі адкрытага правахілісцкага тыпу, якія часта ў гэтай справе проста злучаюцца з вялікадзяржаўнымі настроямі расійскага шавінізму, якія (тэндэнцыі) выяўляюцца ў імкненьні згортваньня тэмпаў прамысловага разьвіцьця БССР, раўненьні на «вузкія месцы» і г. д. Гэтыя тэндэнцыі і настроі фактычна вядуць да супраціўленьня справе прамысловага разьвіцьця раней адсталых у гаспадарчых адносінах нацыянальных раёнаў і атрымлівалі і атрымліваюць у нашай арганізацыі рашучы адпор. Але адначасова з гэтым, асабліва ў апошні час, нам прыходзіцца сустракацца з «левымі загібамі», якія выяўляюцца ў патрабаваньнях нерэальных «звыш-індустрыялісцкіх» тэмпаў і вядуць няўхільна да рэвізіі асноўных кірункаў і асноўнай лініі УсеКП(б) у разьвіцьці індустрыялізацыі ва ўсім сьвеце.

У барацьбе з гэтымі тэндэнцыямі і адхіленьнямі ад лініі партыі, наша арганізацыя будзе з посьпехам вырашаць задачы па прамысловым разьвіцьці нашай рэспублікі і выкананьні, у абстаноўцы вялікага творчага ўздыму пралетарскіх мас, пяцігадовага пляну за чатыры гады. XIII зьезд нашай партыі павінен прайсьці пад знакам выкананьня гэтай асноўнай задачы.

У цэнтры ўвагі нашай партыі, у цэнтры ўвагі раённых і акруговых партыйных канфэрэнцый, якія пачаліся зараз перад зьездам, стаяць пытаньні калектывізацыі і выпраўленьня памылак і грубых скрыўленьняў партыйнай лініі, меўшых месца і ў нас, у БССР.

Мы мелі ў нас, у БССР, шырокую і магутную хвалю бядняцка-серадняцкіх мас у калгасы. Таксама, як і ў цэлым радзе іншых арганізацый УсеКП(б), у нашай беларускай арганізацыі гэтыя хуткія і лёгкія посьпехі парадзілі галавакружэньне, буйненькія перагібы і скажэньні лініі партыі. Бюро ЦК у сваёй рэзалюцыі ад 17 красавіка адзначыла, што і ў КП(б)Б правільная палітычная лінія ЦК УсеКП(б) у пытаньнях калгаснага будаўніцтва і ліквідацыі кулацтва, як клясы, на аснове суцэльнай калектывізацыі, была скажана радам партыйных арганізацый. Гэтыя перагібы і скажэньні лініі партыі выявіліся ў нас, у КП(б)Б, у небальшавіцкім падыходзе да серадняка, у антысерадняцкіх перагібах. Цэлы рад мясцовых арганізацый замянілі шырокую масавую работу па мабілізацыі беднаты і серадняку, работу на самастойнай арганізацыі беднаты—прымусам і адміністраваньнем. У радзе месц быў парушан ленінскі прынцып добраахвотнасьці ў калгасным руху. Наперакор указаньням лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б), пастановам ЦК УсеКП(б) аб тэмпах калектывізацыі і студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б асобныя арганізацыі заняліся недапушчальнай гульнёй у нерэальныя тэмпы калектывізацыі, зусім ня ўлічваючы асабліваснасьці БССР, як пязбожавага раёну. Галавакружэнне спаборніцтва, імкненьне «дагнаць і перагнаць» буйназбожжавыя вобласьці Савецкага Саюзу, нясумненьна налажылі свой адбітак на практыку калгаснага будаўніцтва ў БССР.

У радзе месц пры ажыцьцяўленьні лёзунгу нашай партыі аб ліквідацыі кулацтва, як клясы, арганізацыі не мабілізавалі ў дастатковай меры вакол гэтага лёзунгу шырокіх бядняцка-серадняцкіх мас, а ў практычным правядзеньні раскулачваньня, якое ў радзе выпадкаў праводзілася не на аснове суцэльнай калектывізацыі закранялі і серадняка. Бюро Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б зусім ясна заявіла, што ўсе гэтыя памылкі і скажэньні знаходзяцца ў рэзкай супярэчнасьці з правільнай палітычнай лініяй і правільнымі дырэктывамі ЦК УсеКП(б).

Асобныя акругі БССР (Мазыр, Віцебск, Магілеў), ня гледзячы на тое, што студзеньскі пленум ЦК КП(б)Б зазначыў, як арыентыровачную лічбу калектывізацыі, 35 проц. яравога кліну да вясны бягучага году, паставілі сваёй задачай калектывізаваць цалкам усе бядняцка-серадняцкія сялянскія гаспадаркі ўжо да вясны гэтага году. Авантурніцкія тэмпы ў радзе месц ня толькі не атрымалі належнага адпору ў асобных зьвёньнях партыйнага кіраўніцтва, але захапілі гэтыя зьвёньні, якія паддаліся моцнаму «галавакружэньню ад посьпехаў» і ня здолелі своячасова і хутка стаць на чале выпраўленьня памылак.

Якая была лінія Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б у пытаньнях кіраўніцтва калгасным рухам і ці была яна правільнай лініяй? Цэнтральны Камітэт КП(б)Б, кіруючыся дырэктывамі ЦК УсеКП(б), ажыцьцяўляў правільную палітычную лінію. Яшчэ на студзеньскім пленуме наш ЦК, кіруючыся дырэктывамі ЦК УсеКП(б), перасьцерагаў «ўсе партыйныя арганізацыі супроць якога-б там ні было «дэкратаваньня» зьверху калгаснага руху, «супроць гульні ў калектывізацыю». ЦК КП(б)Б ня раз у сваіх выступленьнях папярэджваў небясьпеку антысерадняцкіх перагібаў і скажэньня партыйнай лініі. Але пры гэтай правільнай палітычнай лініі ЦК дапусьціў рад асобных памылак, якія ім прызнаны цалкам і поўнасьцю ў сваёй пастанове ад 17 красавіка. Гэтыя памылкі заключаліся ў тым, што ЦК ня даў своячасова «даволі рашучага адпору няправільным тэндэнцыям з боку некаторых мясцовых партарганізацый закончыць суцэльную калектывізацыю бягучай вясной і ў тым, што студзеньскі пленум ЦК КП(б)Б, даючы дырэктыву аб абагуленьні жывёлы, не падкрэсьліў, «што гутарка ідзе аб абагуленьні рабочай і таварна-прадукцыйнай часткі рагатай жывёлы» і ў тым, што студзеньскі пленум, кажучы аб неабходнасьці пры распрацоўцы статуту сельска-гаспадарчай арцелі «максімальна забясьпечыць пераход ад сельска-гаспадарчай арцелі да камуны», даваў такім чынам несваячасовае ўказаньне, якое магло спрыяць умацненьню існуючых на мясцох тэндэнцый да заўчаснага пераходу ад арцелі да камуны. Цэнтральны Камітэт прызнаў, што пастанова студзеньскага пленуму аб калектывізацыі ў тэй частцы, у якой «яна ўстанаўляе тэрмін поўнай калектывізацыі БССР да канца 1931 году, не адпавядае пастановам ЦК УсеКП(б)».

Пасьля своячасовых дырэктыў ЦК УсеКП(б) і артыкулаў тав. Сталіна, наша арганізацыя, пад кіраўніцтвам свайго Цэнтральнага Камітэту, стала на шлях рашучага выпраўленьня меўшых месца памылак і перагібаў. Цэнтральны Камітэт заклікаў ўсе партыйныя арганізацыі, да хутчэйшага выпраўленьня перагібаў на аснове рашучай крытыкі і самакрытыкі, да замацаваньня дасягненьняў, да арганізацыйна--практычнай работы ў калгасах і да разгортваньня бальшавіцкай сяўбы. Партарганізацыя і ЦК з усёй рашучасьцю ўдарылі па тых элемэнтах, якія ўпарта не жадалі прызнаваць сваіх памылак, настойваючы на правільнасьці сваіх галавацянскіх авантурніцкіх установак (Шклоў, Рагачэў і г. д.). Мы можам зараз сьмела заявіць, што дзякуючы правільнаму кіраўніцтву ЦК УсеКП(б) наша арганізацыя ў асноўным перамагла труднасьць хуткай перабудовы сваіх радоў і здолела ў агульным стаць на правільныя рэйкі бальшавіцкай самакрытыкі і сьмелага выпраўленьня дапушчаных скрыўленьняў партыйнай лініі.

Адлівы, якія меліся з калгасаў у выніку перагібаў і скажэньня партыйнай лініі, зараз у асноўным прыпыніліся. Там, дзе арганізацыя, замест апартуністычнай балбатні аб «адступленьні», замест супраціўленьня хуткаму выпраўленьню памылак, безагаворачна праводзіць дырэктывы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б, мы маем факты новага прыліву ў калгасы і іх папырэньня.

Па якой-жа лініі ідуць вылазкі апартуністычных элемэнтаў, у сувязі з тымі памылкамі, якія былі дапушчаны радам мясцовых арганізацый у практыцы калгаснага будаўніцтва? Мы маем у арганізацыі спробы адкрытых выступленьняў з намерам, пад выглядам «крытыкі», узваліць усю адказнасьць за меўшыя месца памылкі і перагібы на палітычную лінію ЦК КП(б)Б. У гэтых спробах мы бачым бясспрэчнае імкненьне да рэвізіі генэральнай лініі партыі па калектывізацыі, мы маем тэндэнцыю да таго, каб кідаць каменьнікі правааапартуністычнай крытыкі на лінію ўсёй УсеКП(б) і яе Цэнтральнага Камітэту.

Маюцца праваўхілісцкія тэндэнцыі над выглядам выпраўленьня «левых» перагібаў зьняць лёзунг ліквідацыі кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі, як генэральны лёзунг нашай партыі і надпярэднуць фактычнай рэвізіі нашыя ўстаноўкі на далейшае пасьпяховае разьвіцьцё калектывізацыі --справы сацыялістычнай рэканструкцыі вёскі. Сярод асобных элемэнтаў ёсьць спробы вытлумачыць адлівы ў асноўным не перагібамі, не галавацянствам, а ці тэорыямі аб няўхільнасьці хістаньняў серадняцтва, ці тым, што арганізацыя «не вяла выстарчальнай практычнай работы». Ёсьць спробы вытлумачыць грубыя скрыўленьні партыйнай лініі «пры правядзеньні калектывізацыі» няўхільнасьцю памылак. Адразу-ж пасьля зьяўленьня артыкулу тав. Сталіна «Галавакружэньне ад посьпехаў», у асобных рённых арганізацыях былі факты адкрытых выступленьняў супроць гэтага артыкулу і дырэктыў ЦК УсеКП(б) і спробы вытлумачыць іх, як «адступленьне», г. ё. «удар» па калгасным руху.

Такім чынам, мы бачым, што адбываецца нясумненнае ажыўленьне права і «лева» - апартуністычных элемэнтаў, што барацьба на два фронты супроць «левага» авантурызму, супроць рэцыдыву трацкісцкіх настрояў і правага апартунізму, як галоўнай небясьпекі, і надалей застаецца генэральнай задачай нашай партыі ў барацьбе за бальшавіцкую лінію.

Увесь пройдзены пэрыяд і асаблі

КАЛГАСНЫ РУХ І ЎЗДЫМ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ

(Тэзісы дакладу т. Я. ЯКАЎЛЕВА на 16-м зьезьдзе ЎсеКП(б), ухваленыя Палітбюро ЦК УсеКП(б) 18-га мая 1930 г.)

1. Вынікі калгаснага руху

5½ гады, якія прайшлі з часу 15-га зьезду партыі, былі пэрыядам вялізарнейшага пералому ў разьвіцьці сельскай гаспадаркі СССР. Гэты пералом характарызуецца тым, што на 1-га мая 1930 г. у асноўных збожжавых раёнах вытвараючых абласьцей калектывізацыя ахапіла 40-50 проц. сялянскіх гаспадарак замест 2-3 проц. гаспадарак вясной 1928 г., а пасеўная плошча калгасаў па СССР з 1,5 млн. гэктараў вясной 1928 г. падымаецца, як гэта і прадугледжвалася пастановай Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б) ад 5-га студзеня, прыкладна да 30-35 млн. гэкт. вясной 1930 г., ня кажучы азімага кліну. У выніку гэтага калгасы разам з саўгасамі ўжо ў гэтым годзе ў дадуць асноўную частку тавараў збожжавай прадукцыі мінулых гадоў пэрыяду 15-га зьезду і 16-й канфэрэнцыі, калі пераважная частка тавараў збожжавай прадукцыі рабілася індывідуальнай, сялянскай у тым ліку і кулацкай гаспадаркай.

Такім чынам партыя вырашае на праве асноўную і труднейшую праблему сельскае гаспадаркі — збожжавую праблему.

Сусьветна - гістарычнае значэньне пералому ў разьвіцьці СССР заключаецца ў тым, што:

1. Значная часьць серадняцкай масы важнейшых збожжавых раёнах, сьледам за беднякамі зразумела, пераважнай буйной аграмаджанай гаспадарцы, аб'ядналася добраахвотна ў калгасы і паводзячы сяўбу на калектыўных полях, і павярнула на сацыялістычны шлях. Тым самым ня толькі тэарэтычна даведзена, але і праверана на практыцы мільёнаў людзей магчымасьць дыктатуры пралетарыяту непасрэднага пераходу ад адсталае, мала прадукцыйнае дробнае і драбнейшае індывідуальнае сялянскае гаспадарцы да буйное, калектыўнае, высока прадукцыйнае гаспадаркі.

2. На аснове разгортваньня суцэльнай калектывізацыі раду раёнаў СССР партыя адыйшла ад ранейшай палітыкі абмежаваньня і выцісканьня капіталістычных элемэнтаў у вёсцы да новай палітыкі — палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы, ажыцьцяўляючы гэту палітыку, як непарыўную сустаўную часьць цэльнай калектывізацыі, якая праводзіцца самімі бядняцкімі і серадняцкімі масамі.

3. У выніку масавага разьвіцьця калгасаў і саўгасаў і распачатай ліквідацыі кулацтва мяняецца самыя суадносіны ў гэтым годзе каля 100 млн. пудоў таварнага збожжа, а ў будучым годзе — ня менш 250 млн. пудоў таварнага збожжа. Гэта паказвае, што на аснове калектывізацыі, разьвіцьця машына-трактарных станцый і арганізацыі саўгасаў партыя можа пачаць ажыцьцяўляць лёзунг «дагнаць і перагнаць» капіталістычныя краі сьвету ня толькі ў адносінах прамысловасьці, дзе перавагі буйное гаспадаркі ўжо даўно выкрыліся з вялізарнай сілай, але і ў абсягу сельскай гаспадаркі, тэмпы разьвіцьця якое да гэтага часу акрэсьліваліся пераважнасьцю крайня малапрадукцыйнай дробнай і найдрабнейшай гаспадаркі, а зараз будуць акрэсьлівацца паскораным разьвіцьцём калгасаў і саўгасаў, якія прадстаўляюць сабою новы тып гаспадаркі, нячуваны ў гісторыі чалавецтва і ўнярыпыню адкрыты практыкай калгаснага будаўніцтва ў СССР.

У адпаведнасьці з гэтым зьезд лічыць неабходным:

1) карэнным чынам перагледзець пяцігадовы плян разьвіцьця сельскай гаспадаркі, выходзячы з тэмпаў калектывізацыі, прадугледжаных пастановай Цэнтральнага Камітэту ад 5-га студзеня і поўнасьцю нацьверджаных на практыцы, з тым, каб на гэтай аснове забясьпечыць побач з паскораным разьвіцьцём збожжавых і тэхнічных культур, падняцьце і ўзмоцненае разьвіцьцё жывёлагадоўлі шляхам, перш за ўсё, разьвіцьця спэцыяльных жывёлагадоўчых саўгасаў аналёгічна збожжа-саўгасам і масавага стварэньня высокатаварных калгасных фэрм;

2) побач з няўхільным захаваньнем прадугледжаных пастановамі партыі ільгот калгасам і калгаснікам, павялічыць у 1930-31 годзе крэдыты калгасам у два разы супроць бягучага году, г. зн. да 1 мільярду рублёў;

3) забясьпечыць засеў па лініі зернятрэсту ў будучым годзе ня менш 4½ млн. гэктараў і падрыхтоўку да пасеву 1932 году 9 млн. гэктараў;

4) забясьпечыць таварны выхад па лініі Сьвіньводтрэсту сьвіней у 1930-31 годзе ня менш 400 тыс., у 1931-32 г. ня менш 3 млн. штук, і ў 1932-33 г. ня менш 7 млн. штук;

5) давесьці лік штук стада «Скотовода» ў 1930-31 годзе да 3,2 млн. штук, у 1931-32 г. 5,5 млн. штук, у 1932-33 г. —да 9-10 млн. штук;

6) разьвіваць жывёлагадоўчыя галіны ў калгасах, накіраваўшы на гэту справу значную частку с.-г. крэдытаў;

7) даручыць с.-г. акадэміі імя Леніна распрацаваць пытаньне аб рацыянальным пашырэньні сельскае гаспадаркі на тэрыторыі СССР па галінах, культурах; аб замене менш выгодных культур больш выгоднымі культурамі; аб забесьпячэньні СССР магчымасьці самастойнага забесьпячэньня галоўнейшымі харчовымі і тэхнічнымі культурамі; аб магчымасьці максымальнага скарыстаньня ў зямляробстве водных крыніц энэргіі.

У адпаведнасьці з задачамі, якія ўскладаюцца на с.-г. акадэмію імя Леніна, стварыць для яе работы патрэбную тэхнічную базу, якая стаіць на ўзроўні апошніх дасягненьняў навукі і забясьпечыць яе ўзмацненьнем камуністычнымі кадрамі;

8) разгарнуць работу Калгаснага Інстытуту з тым, каб яго работа забясьпечыла свячасовую навукова-апэрацыйную распрацоўку форм і мэтадаў калгаснага будаўніцтва і тэарэтычнае абагульненьне вопыту мясц;

9) забясьпечыць поўнае выкананьне праграмы трактарабудаўніцтва і вытворчасьці трактарнага прычэпнага інвэнтару ў разьмерах, вызначаных пастановамі ЦК.

2. Узмацненьне асноў калгаснага руху ў барацьбе з памылкамі

Замацаваньне дасягнутых посьпехаў абсягу калектывізацыі і на гэтай аснове далейшае разьвіцьцё калектывізацыі магчымы толькі пры ўмове няўхільнага ўжываньня на практыцы навучных карэнных марксыцка - ленінскіх прынцыпаў калгаснага руху, адхіленьне ад якіх зьяўляецца вельмі шкодным злачынствам супроць дыктатуры пралетарыяту:

1. Калгасы могуць быць пабудаваны толькі на аснове добраахвотнасьці. Усякая спроба ўжываньня гвалту або міністрацыйнага прымусу ў адносінах да бядняцка - серадняцкіх мас у гэтых галіны калектыву зьяўляецца грубым парушэньнем лініі партыі і злоўжываньнем уладай.

2. Асноўнай формай калгасу на данай стадыі зьяўляецца с.-г. арцель. Патрабаваць, каб сяляне, уступаючы ў арцель, безадкладна адмовіліся ад усякіх індывідуалістычных навыкаў і інтэрэсаў, ад магчымасьці весьці дадатковую гарадзкае асабістую гаспадарку (каза, авечкі, птушкі, прысядзібны агарод, ад магчымасьці скарыстаньня для іншае заработкаў на баку і г. д. — значыць, забываць азбуку марксызму - ленізму.

3. Форма калгасаў павінна адпавядаць гаспадарчым асабліваснямі раёну данае гаспадаркі. Побач з арцельлю— некаторых раёнах нізбожжавага хаўтару, а таксама ў нацыянальных раёнах **Усходу**, можа мець на першы час масавае пашырэньне таварыства на гарадзкай апрацоўцы зямлі, як пераходная форма да арцелі.

4. Калгасны рух можа падымацца да вышэйшай формы — камуны, у адпаведнасьці з павышэньнем тэхнічнай базы, ростам калгасных кадраў і культурнага ўзроўню калгаснікаў пры абавязковай умове прызнаньня самімі сялянамі адпаведных зьмен у статуце і іх ажыцьцяўленьня зьнізу.

5. Неабходнае для дасягненьня вышэйшай прадукцыйнасьці працы стварэньне ў калгасах новай грамадзкай дысцыпліны можа быць дасягнута толькі на аснове сапраўднай самадзейнасьці і актыўнага ўдзелу калгаснікаў у кіраўніцтве гаспадаркай калектыву.

6. Пераход да калектыўнага зямляробства можа быць ажыцьцёўлен, як гэта ня раз указваў Ленін, толькі пры ўмове аказаньня калгасам шырокай арганізацыйнай, матар'яльнай і фінансавай дапамогі з боку савецкай дзяржавы: «Кожны грамадзкі лад узьнікае толькі пры фінансавым падтрыманьні поўнай клясы» (Ленін, «О кооперацыі», том 18, частка 2-ая, стар. 141).

7. Антыленінскай зьяўляецца ўсякая спроба перанясеньня на калгасы арганізацыйнай сыстэмы кіраўніцтва саўгасамі, бо ў адрозьненьне ад саўгасу, які зьяўляецца дзяржаўным прадпрыемствам, створаным на сродкі дзяржавы, калгас зьяўляецца добраахвотным грамадзкім аб'яднаньнем сялян, створаным на сродкі саміх сялян з усімі выцякаючымі адсюль вынікамі.

8. Пераход ад гаспадаркі індывідуальнай да гаспадаркі калектыўнай можа ажыцьцявіцца толькі на аснове саюзу рабочае клясы і беднаты з серадняком, што абавязвае да сыстэматычнага прыцягненьня сераднякоў да калгаснага кіраўніцтва.

Выходзячы з усяго гэтага, зьезд лічыць асабліва важным усьведамленьне кожным членам партыі характару тых памылак і скажэньняў лініі партыі, якія мелі месца вясной гэтага году ў практыцы правядзеньня калектывізацыі. Гэтыя памылкі і скажэньні выяўляліся ва ўжываньні мер прымусу і гвалту ў адносінах да сераднякоў і беднякоў пры пабудове калгасаў; у багуленьні ў членаў арцелі дробнае жывёлы і кароў, якія маюць спажывецкае значэньне; у перанясеньні на нізбожжавыя раёны тэмпаў калектывізацыі, апраўдаўшых сябе на практыцы і прадугледжаных пастановамі ЦК толькі ў адносінах збожжавых раёнаў; у скарасьпелым стварэньні камун без адпаведнай матар'яльнай і арганізацыйнай падрыхтоўкі; у стварэньні пад выглядам калгасаў-«гігантаў» — няжыцьцёва бюракратычных арганізацый, пабудаваных на прынцыпах камандаваньня; у затрыманьні прызначаных урадам для калгасаў крэдытаў і пазбаўленьні калгасьнікаў даных урадам ільгот; у грубым адміністраваньні ў адносінах да калгасаў і калгаснікаў і замене выбарнасьці назначэньнем, камандаваньнем зьверху; у запіраньні серадняка і нескарыстаньні яго гаспадарчай практыкі; у перанясеньні на серадняка мер барацьбы, накіраваных супроць кулака («раскулачваньне», пазбаўленьне выбарчых правоў і г. д.).

Сутнасьць гэтых памылак і галоўнейшых скажэньняў лініі партыі, атрымаўшых пашырэньне асабліва ў радзе раёнаў спажываючай паласы і ў нацыянальных рэспубліках і абласьцёх Усходу СССР, Цэнтральны Камітэт у сваёй адозьве ад 2-га красавіка акрэсьліў наступным чынам: «Палітыка ўмацаваньня саюзу з серадняком пры апоры на беднату і бязьлітаснай барацьбе з кулацтвам стала падмяняцца наскрозь варожай ленінізму палітыкай камандаваньня ў адносінах да серадняка». (Адозва ЦК ад 2 красавіка 1930 г.).

Калі-б гэтыя памылкі ня былі сваячасова выпраўлены Цэнтральным Камітэтам партыі (пастанова ЦК ад 20-II, 10-III, 17-III, 2-IV і артыкулы т. Сталіна «Галавакружэньне ад посьпехаў» і «Адказ таварышом-калгаснікам»), — гэта пагражала-б зрывам справы калектывізацыі сельскай гаспадаркі, падрывам самае асновы савецкае дзяржавы—саюзу рабочае клясы з сялянствам.

Усе меры, прынятыя Цэнтральным Камітэтам для выпраўленьня памылак, дапушчаных у практыцы калектывізацыі, у выніку зводзіліся да ўстанаўленьня правільных ленінскіх адносін да серадняка, парушаных у радзе раёнаў, да замацаваньня дасягненьняў калгаснага руху і да ажыцьцяўленьня палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы, на аснове суцэльнай калектывізацыі і ў саюзе з серадняком.

Рэзультатам выпраўленьня памылак партыйных і савецкіх органаў зьяўляецца той факт, што ў рашаючых збожжавых раёнах індывідуальнікі энэргічна праводзяць сяўбу пры адначасовым павялічэньні ліку найбольш устойлівых калгасаў, якія могуць стаць для асноўных сялянскіх мас гэтых раёнаў ядром будучага калгаснага руху.

3. Аб тэмпах калектывізацыі і задачах перабудовы сельскай гаспадаркі

Ход разгортваньня веснавой сяўбы ў 1930 г. паказвае, што на аснове калектывізацыі і насаджэньня саўгасаў партыі ўдаецца дабіцца вырашэньня труднейшай збожжавай праблемы. Вырашэньне збожжавай праблемы ў сваю чаргу ня толькі палягчае ў далейшым разьвіцьцё тэхнічных культур і жывёлагадоўлі, але і вырашае пытаньне аб магчымасьці шляхам разьвіцьця калектыўнай і дзяржаўнай гаспадаркі, выхаду іншых галін сельскай гаспадаркі з труднасьцяй непераможных для малапрадукцыйнай дробнай і драбнейшай гаспадаркі.

Магчымыя тэмпы далейшага разьвіцьця збожжавай гаспадаркі і перамаганьня крызісу жывёлагадоўчай гаспадаркі акрэсьліваюцца тымі вялізнымі магчымасьцямі разьвіцьця прадукцыйных сіл, якія тояць у сабе калгасы.

Ужо гэтай вясной ня толькі старыя міжсяленныя машына-трактарныя станцыі і старыя калгасы, але і новыя калгасы, пабудаваныя на аснове простага ўлажэньня сялянскага інвэнтару ня маючыя яшчэ выстарчальнай арганізацыйнай і гаспадарчай практыкі, здолелі значна пашырыць свае пасеўныя плошчы і пусьціць у ход закінутыя землі і цаліны. Апрача таго, магчымасьці, што адкрываюцца з разьвіцьцём саўгасаў, характарызуюцца тым фактам, што адны саўгасы (старыя і новыя) дадуць ужо ў гэтым годзе каля 100 млн. пудоў таварнага збожжа, а ў будучым годзе — ня менш 250 млн. пудоў таварнага збожжа. Гэта паказвае, што на аснове калектывізацыі, разьвіцьця машына-трактарных станцый і арганізацыі саўгасаў партыя можа пачаць ажыцьцяўляць лёзунг «дагнаць і перагнаць» капіталістычныя краі сьвету ня толькі ў адносінах прамысловасьці, дзе перавагі буйное гаспадаркі ўжо даўно выкрыліся з вялізарнай сілай, але і ў абсягу сельскай гаспадаркі, тэмпы разьвіцьця якое да гэтага часу акрэсьліваліся пераважнасьцю крайня малапрадукцыйнай дробнай і найдрабнейшай гаспадаркі, а зараз будуць акрэсьлівацца паскораным разьвіцьцём калгасаў і саўгасаў, якія прадстаўляюць сабою новы тып гаспадаркі, нячуваны ў гісторыі чалавецтва і ўнярыпыню адкрыты практыкай гаспадарчага будаўніцтва ў СССР.

У адпаведнасьці з гэтым зьезд лічыць неабходным:

1) карэнным чынам перагледзець пяцігадовы плян разьвіцьця сельскай гаспадаркі, выходзячы з тэмпаў калектывізацыі, прадугледжаных пастановай Цэнтральнага Камітэту ад 5-га студзеня і поўнасьцю нацьверджаных на практыцы, з тым, каб на гэтай аснове забясьпечыць побач з паскораным разьвіцьцём збожжавых і тэхнічных культур, падняцьце і ўзмоцненае разьвіцьцё жывёлагадоўлі шляхам, перш за ўсё, разьвіцьця спэцыяльных жывёлагадоўчых саўгасаў аналёгічна збожжа-саўгасам і масавага стварэньня высокатаварных калгасных фэрм;

2) побач з няўхільным захаваньнем прадугледжаных пастановамі партыі ільгот калгасам і калгаснікам, павялічыць у 1930-31 годзе крэдыты калгасам у два разы супроць бягучага году, г. зн. да 1 мільярду рублёў;

3) забясьпечыць засеў па лініі зернятрэсту ў будучым годзе ня менш 4½ млн. гэктараў і падрыхтоўку да пасеву 1932 году 9 млн. гэктараў;

4) забясьпечыць таварны выхад па лініі Сьвіньводтрэсту сьвіней у 1930-31 годзе ня менш 400 тыс., у 1931-32 г. ня менш 3 млн. штук, і ў 1932-33 г. ня менш 7 млн. штук;

5) давесьці лік штук стада «Скотовода» ў 1930-31 годзе да 3,2 млн. штук, у 1931-32 г. 5,5 млн. штук, у 1932-33 г. —да 9-10 млн. штук;

6) разьвіваць жывёлагадоўчыя галіны ў калгасах, накіраваўшы на гэту справу значную частку с.-г. крэдытаў;

7) даручыць с.-г. акадэміі імя Леніна распрацаваць пытаньне аб рацыянальным пашырэньні сельскае гаспадаркі на тэрыторыі СССР па галінах, культурах; аб замене менш выгодных культур больш выгоднымі культурамі; аб забесьпячэньні СССР магчымасьці самастойнага забесьпячэньня галоўнейшымі харчовымі і тэхнічнымі культурамі; аб магчымасьці максымальнага скарыстаньня ў зямляробстве водных крыніц энэргіі.

У адпаведнасьці з задачамі, якія ўскладаюцца на с.-г. акадэмію імя Леніна, стварыць для яе работы патрэбную тэхнічную базу, якая стаіць на ўзроўні апошніх дасягненьняў навукі і забясьпечыць яе ўзмацненьнем камуністычнымі кадрамі;

8) разгарнуць работу Калгаснага Інстытуту з тым, каб яго работа забясьпечыла свячасовую навукова-апэрацыйную распрацоўку форм і мэтадаў калгаснага будаўніцтва і тэарэтычнае абагульненьне вопыту мясц;

9) забясьпечыць поўнае выкананьне праграмы трактарабудаўніцтва і вытворчасьці трактарнага прычэпнага інвэнтару ў разьмерах, вызначаных пастановамі ЦК.

4. Аб падрыхтоўцы масавага калгаснага руху ў нізбожжавых раёнах

Зьезд зварачае ўвагу ўсіх партыйных арганізацый нізбожжавых раёнаў, а таксама ўсходніх рэспублік і абласьцей СССР на неабходнасьць разгортваньня ў гэтых раёнах вялікай падрыхтоўчай работы да масавага калгаснага руху. Гэта падрыхтоўчая работа перш за ўсё павінна складацца з:

1) разьвіцьця каапэрацыйнай арганізацыі бядняцкага і серадняцкага сялянства, пачынаючы з насёлкавых таварыстваў і спэцыяльна вытворча-бытавых каапэрацыйных аб'яднаньняў;

2) масавага пашырэньня таварыстваў па грамадзкай апрацоўцы зямлі, як перша-пачатковай формы калгасу, пераходнай да арцелі;

3) усямернага ўзмацненьня існуючых калгасаў і разгортваньня сеткі машынна-трактарных станцый;

4) насаджэньня саўгасаў, асабліва бавоўняных, малочна-агародных, ільняных, жывёлагадоўчых;

5) узмоцненага наступленьня на кулака ў сэнсе далейшага абмежаваньня яго эксплёататарскіх тэндэнцый і яго росту, ва ўсямерным разьвіцьці арганізацыі беднаты;

6) узмацненьня работы на выпрацоўцы тыпу буйное гаспадаркі ў галінах, характэрных для даных раёнаў, і арганізацыі вытворчасьці машын, якія садзейнічаюць пастаноўцы такое гаспадаркі (машыны для сяўбы, апрацоўкі і ўборкі ільну, канапель, бавоўны, насадкі і апрацоўкі бульбы, машына-агародны інвэнтар, машыны для буйных малочных фэрм і г. д.).

Асаблівую ўвагу зварачае зьезд на абсалютную недапушчальнасьць недаацэнкі існуючых у гэтых раёнах калгасаў толькі таму, што іх ёсьць вясной гэтага году 7-8 процантаў замест тых, якія лічыліся раней на паперы. Зьезд лічыць недапушчальным ігнараваньне гэтых калгасаў, маючы практыку калектывізацыі ў збожжавых раёнах, дзе летась лік калгасаў не перавышаў ліку калгасаў, які цяпер ёсьць у спажываючай паласе і дзе гэта вялікая колькасьць калгасаў адыграла важнейшую ролю ў далейшым разьвіцьці ўсяго калгаснага руху, паколькі ў асобе калгасаў стваралися ўзоры і прыклады для ўсёй іншай сялянскай масы, з іх выкоўваліся кадры, стаўшыя пры далейшым разгортваньні калгаснага руху арганізатарамі масавай калектывізацыі.

5. Узаемаадносіны калгасаў з індывідуальнікамі

Улічваючы ўсю складанасьць надыходзячага ў бліжэйшыя гады поўнага пераходу ад дробна-індывідуальнае гаспадаркі да буйное калектыўнае, асабліва пры наяўнасьці на вялізнай тэрыторыі ўсходу СССР дакапіталістычнага укладу і адсутнасьці яшчэ масавых узораў буйное гаспадаркі ва ўсіх нізбожжавых раёнах,—зьезд папярэджвае партыйныя арганізацыі ад якога-б там ні было ігнараваньня індывідуальнае гаспадаркі, якая ў радзе раёнаў краю будзе існаваць яшчэ адносна доўга.

Устанаўленьне правільных адносін да індывідуальнае гаспадаркі, якія-б у далейшым палягчалі калектывізацыю, становіцца ў значнай меры пытаньнем аб узаемаадносінах калгаснікаў і індывідуальнікаў. Абвостраныя адносіны паміж калгаснікамі і індывідуальнікамі, якія ўстанавіліся вясной гэтага году ў выніку адыходаў з калгасаў і барацьбы найбольш актыўных і адданых справе калектывізацыі калгаснікаў для лаханьня калгасаў, зьяўляюцца тормазам далейшай калектывізацыі.

Таму зьезд абавязвае ўсе партыйныя арганізацыі дабіцца таго, каб ва ўзаемаадносінах калгаснікаў з індывідуальнікамі ўстанавілася правіла: не цкаваць індывідуальнікаў, а аказваць ім дапамогу і ўсямерна прыцягваць да калгасу.

Зьезд катэгарычна асуджае мавчае ігнараваньне каапэрацыйнай формы арганізацыі індывідуальных беднякоў і сераднякоў сялян, разьвіцьцё якое зьяўляецца адным з важнейшых умоў паступовага пераходу да калгасаў.

Зьезд лічыць груба няправільнай маючую месца ў радзе раёнаў слабога калгаснага руху фактычную ліквідацыю нізавых форм прасьцейшай каапэрацыйнай арганізацыі (насёлкавыя таварыствы і спэцыяльныя вытворча-бытавыя таварыствы) і прапануе ўсім партыйным арганізацыям безадкладна забясьпечыць аднаўленьне і далейшы рост каапэрацыйнай арганізацыі, аказваючы ёй адпаведнае арганізацыйнае і фінансавае падтрыманьне.

6. Арганізацыйныя пытаньні калгаснага руху

1. Стварэньне калгасных кадраў зьяўляецца адной з важнейшых умоў узмацненьня калектывізацыі. У аснову работы над стварэньнем калгасных кадраў павінна быць пакладзена вылучэньне новых кадраў з масы саміх калгаснікаў. Гэта-ж зьяўляецца важнейшай задачай накіраваных на работу ў калгасы 25 тыс. рабочых, з якіх многія ўжо пасьпелі праявіць сябе дасканалымі арганізатарамі калгаснай гаспадаркі і заваявалі аўтарытэт сярод калгаснікаў, у асаблівасьці ў тых выпадках, калі яны ставілі сваёй галоўнай задачай дапамагаць вырошчваньню новых кадраў з саміх калгаснікаў.

Партыя зыходзіць з таго, што ў бліжэйшыя год-два з масы калгаснікаў бязумоўна вылучацца пад узьдзействам перадавых рабочых дзесяткі тысяч сапраўдных арганізатарскіх талентаў, якія стануць сапраўднымі будаўнікамі сацыялізму.

Галоўнымі задачамі ў гэтай галіне зьяўляюцца:

а) арганізаваць сыстэму вылучэньня на кіраўнічую работу кадраў з асяродзішча саміх калгаснікаў;

б) паставіць масавую кароткатэрміновую падрыхтоўку калгасных кадраў пры саўгасах, школах сялянскай моладзі, клюбах, с.-г. тэхнікумах, школах другой ступені і машына-трактарных станцыях;

в) шырэй прыцягваць у с.-г. ВНУ і тэхнікумы калгасную моладзь;

г) шырока разгарнуць арганізацыю і работу вытворчых нарад і дэлегацкіх сходаў у калгасах;

д) арганізаваць у калгасах дэлегацкі сход калгаснік. Пабудаваць іх работу такім чынам, каб забясьпечыць выроблваньне калгасных кадраў з жанчын і іх вылучэньне.

2. Цяперашні стан каапэрацыйнай арганізацыі і каапэрацыйнага апарату, якія здараліся ад абслугоўваньня масы індывідуальнікаў і ў той-жа час ні ў якай меры не прыстасаваліся да справы арганізацыйнага і вытворчага кіраўніцтва калгасамі, зьяўляецца недапушчальным. У адпаведнасьці з гэтым зьезд лічыць неадкладным карэнны перагляд усёй арганізацыйнай структуры калгасна-каапэрацыйнай сыстэмы, для чаго патрэбна:

а) функцыі арганізацыйна-вытворчага кіраўніцтва калгасамі (кадры, арганізацыя працы, тэхнічная база, у раёне згуртаваць у адносінах усіх калгасаў раёну ў адзіна раённых сельгассаюзах, ажыцьцяўленьне гэтых мерапрыемстваў правесьці ў галінах, у якіх калектывізавана ня менш 30 проц. усіх сялянскіх гаспадарак;

б) функцыі вытворчага абслугоўваньня і кіраўніцтва ў адносінах да індывідуальных гаспадарак і прасьцейшых аб'яднаньняў, а таксама функцыі загатоўчыя ў адносінах усіх відаў гаспадарак, сканцэнтраваць у раённым с.-г. каапэрацыйным саюзе;

в) ліквідаваць прамежныя акруговыя зьвяньні калгасна-каапэрацыйнай сыстэмы, рашуча ўзмацніць за іх кошт нізавыя зьвяньні калгасна-каапэрацыйнай сыстэмы;

г) перагледзець лік спэцыялізаваных цэнтраў на важнейшых галінах сельскае гаспадаркі;

д) правесьці рашучае скарачэньне адміністрацыйнага апарату каапэрацыі і спыніць самымі рашучымі мерамі разбуханьне апарату ў калгасах, ускладаючы выкананьне адміністрацыйных функцый у калгасах, як правіла на выбарных асоб з асяродзішча калгаснікаў.

3. Работа груп беднаты першапачатковых форм калектыўных гаспадарак павінна быць палепшана і ўзмоцнена. Партыйныя арганізацыі калгасаў павінны забясьпечыць такую пастаноўку работы груп беднаты, каб яны ня толькі абаранялі непасрэдныя інтарэсы беднаты, але і дапамагала ўзмацненьню саюзу рабочае клясы і вясковай беднаты з сераднякамі.

4. Увесьці патрэбныя зьмены і прыкладны статут с.-г. арцелі згодна ўказаньняў практыкі і вопыту работы арцеляй.

5. Распрацаваць прыкладны статут ТСОЗ і камуны.

У аснову прыкладнага статуту ТСОЗ палажыць аб'яднаньні працы членаў ТСОЗ за час пасеву і ўборкі і набыцьця за лік даходаў таварыства складаных машын і іншых сродкаў вытворчасьці агульнага ўладаньня і карыстаньня.

У аснову прыкладнага статуту камуны пакласьці поўнае абагуленьне ўсіх без выключэньня сродкаў вытворчасьці, а таксама паступовае стварэньне ўстаноў і прадпрыемстваў па абслугоўваньні патрэб калгаснікаў (сталоўка, грамадзкія жыльлёвыя будынкі і інш.), ні ў якім выпадку не падмяняць гэтых задач непатрэбным і шкодным дробным аграмаджаньнем быту.

Партыі ўдалося ў прайшоўшы паміж XV і XVI зьездамі пэрыяд дабіцца рашаючага пералому ў мэтах калектывізацыі сельскае гаспадаркі. Калі канфіскацыя зямлі ў памешчыкаў была першым крокам Кастрычніцкай рэвалюцыі ў вёсцы, то пераход да калгасаў зьяўляецца другім і прытым рашаючым крокам, які акрэсьлівае важнейшы этап у справе набудаваньня фундаманту сацыялістычнага грамадзтва ў СССР. Зразумела, што такі найвялікшы пераварот, як пераход ад індывідуальнай, дробнай сялянскай гаспадаркі да буйной аграмаджанай гаспадаркі нямінуча зьвязан з радам вялізарных труднасьцяй, якія выклікаюцца абастрэньнем супраціўленьня клясавых ворагаў унутры краіны і наяўнасьцю капіталістычнага акружэньня звонку.

Таму толькі бюракраты і чыноўнікі, а не рэвалюцыянары, могуць думаць, што пераварот такога значэньня, які датычыць самых асноў ладу гаспадаркі і жыцьця вялізных мас, можа быць ажыцьцёўлен бяз труднасьцяй, без абвастрэньня клясавай барацьбы і зьвязаных з гэтым хістаньняў серадняка. Кулак яшчэ не дабіт і будзе аказваць шалёнае супраціўленьне пераможнаму прасоўваньню калектывізацыі. Ліквідацыя кулацтва, як клясы, патрабуе доўгай упартай барацьбы з кулаком, сыстэматычнай работы над правядзеньнем калектывізацыі і павінна разгортвацца ў поўнай адпаведнасьці з ажыцьцяўленьнем суцэльнай калектывізацыі, як яе неадлучная частка.

У арцелях не завяршаецца, а толькі пачынаецца справа стварэньня новай грамадзкай дысцыпліны, справа навучаньня сялян сацыялістычнаму будаўніцтву. У калгасах сяляне канчаткова пазбавяцца дробна-ўласьніцкай псыхалёгіі, вострага жаданьня прыватна - гаспадарчага накапленьня, атрымаўшага у спадчыну ад накапленьняў дробных прыватных уласьнікаў, у выніку гадоў упартай работы над падвядзеньнем над калгасы базы буйнай мэханізаванай гаспадаркі, упартай работы над стварэньнем кадраў з асяродзішча саміх калгаснікаў і культурнага ўздыму ўсёй калгаснай масы.

Партыя дабілася рашаючага пералому ў справе калектывізацыі, дзякуючы таму, што былі разгромлены як контр-рэвалюцыйны трацкізм, палітыка якога няўхільна вяла да разрыву з асноўнымі масамі сялянства, так і правыя ўхілістыя з іх палітыкай адмаўленьня ад праводзімай партыяй індустрыялізацыі краю, адмаўленьня ад насаджэньня саўгасаў і разьвіцьця калгасаў, з іх палітыкай капітуляцыі перад кулацтвам.

Партыя дабілася рашаючага пералому ў справе калектывізацыі, няўхільна ажыцьцяўляючы палітыку індустрыялізацыі краю, тым самым стварала ўмовы для разьвіцьця вытворчых форм змычкі сялянства, узмацняючы саюз рабочае клясы і вясковай беднаты з серадняком. Толькі такім шляхам партыя магла стварыць патрэбныя ўмовы для калгаснага будаўніцтва. Толькі такім шляхам партыя дабіцца ня толькі замацаваньня дасягнутых посьпехаў, але і завершыць справу калектывізацыі, кладучы тым самым фундамант сацыялістычнага грамадзтва.

Я. ВАСІЛЕВІЧ

КП(б)Б у барацьбе за бальшавіцкую лінію

(АД XII ДА XIII ЗЬЕЗДУ КП(б)Б)

Становішча БССР, як фарпосту Савецкага Саюзу, які знаходзіцца на рубяжы з капіталістычным Захадам, крайня адсталасьць гаспадаркі, амаль поўная адсутнасьць прамысловасьці, а вёска і слабы колькасна пралетарыят, што засталеся ў спадчыну ад царызму, таданы нацыянальны пераплёт — гэта значна ўскладняе задачы партыі ў абсягу кіраўніцтва сацыялістычным будаўніцтвам нашай рэспублікі.

Няма патрэбы гаварыць аб вялізарных дасягненьнях, якія мае Савецкая Беларусь за ўсе апошнія гады ў абсягу адбудаваньня зруйнаванае гаспадаркі, яе сацыялістычнай рэканструкцыі. За пэрыяд ад XII зьезду КП(б)Б, БССР, пад кіраўніцтвам нашай партыі, зрабіла вялікарны крок наперад у справе індустрыялізацыі і сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі. Пры дапамозе ўсяго Савецкага Саюзу мы маем вельмі дасягненьні ва ўсіх абсягах гаспадарчага жыцьця краю. Даволі прыгадаць толькі некаторыя лічбы, каб бачыць, які вялізарны скачок зроблен савецкай Беларусьсю за першыя пяцігады пяцідоўкі. Калі 1928-29 г. даўжэйшая прадукцыя прамысловасьці БССР на 45,7 проц., то 1929-30 год дае рост на 77,5 проц. Сума ўкладаньняў у капітальнае будаўніцтва ў 1928-29 г. раўнялася 25,8 млн. р., у 1929-30 г. яна выяўляецца ўжо ў суме каля 50 млн. руб. На будучы год урад БССР намячае ўкладаньні ў прамысловасьць у суме, якая больш чым у два разы перавышае ўкладаньні 1929-30 г. Да канца бягучага году ў БССР будзе пушчана першая раённая гідраўлічная электрастанцыя імя тав. Заліна.

На аснове росту прамысловасьці ў БССР адбываецца рост колькасьці пралетарыяту.

Падрыхтаваная ўсім папярэднім пэрыядам разьвіцьця сацыялістычнага будаўніцтва ва ўсім Саюзе, БССР за гэты пэрыяд шчыльна падышла да практычнага вырашэньня задачы сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Перамагаючы хутарскую сыстэму, мы значны час падтрымлівалася правапартыўнісцкай палітыкай Наркамзему, ламаючы шалёнае супраціўленьне кулацтва, якое знаходзіла гэта простае і непасрэднае падтрыманьне замежнага капіталу, — наша партыя здолела мабілізаваць шырокі рух асноўных сялянскіх мас беларускай вёскі за калектывізацыю. Гаворачы словамі тав. Сталіна, мы маем і ў нас, у БССР, **бясспрэчны паварот вёскі ў бок сацыялізму.**

Выводзячы БССР на шырокую дарогу індустрыяльна - саўгасна - калгаснага будаўніцтва, партыя, дзякуючы правільнаму вырашэньню нацыянальнага пытаньня, дабілася, нясуменна, буйных дасягненьняў у абсягу будаўніцтва беларускай пралетарскай культуры, у абсягу савецкага, нацыянальна - культурнага будаўніцтва.

Ва ўмовах БССР, дзе мы маем значную праслойку дробнай буржуазіі, дзе яшчэ моцны і жывучы традыцыі нацыяналізмаў усіх колераў у асяродзішчы некаторых пластоў працоўных, дзе націск клясавага ворага на асобныя зьвяньні партыі і рабочае клясы асабліва моцны ў выніку адносная слабасьці пралетарыяту, — тут мы маем нясумненна асабліва спрыяючую глебу для правых настрояў, для правай нетрасьпекі.

На якіх вучастках, перш за ўсё, мы мелі ў нас, у Беларусі, скрыўленьні лініі партыі і як ішла наша барацьба з гэтымі скрыўленьнямі?

Партыя правяла рашучую барацьбу з праваапартыўністычнай лініяй Наркамзему БССР, што выяўлялася ў практыцы насаджэньня кулацкіх хутароў, якое спрыяла росту і ўзмацненьню кулацкіх элемэнтаў беларускай вёскі і тармазіла рост і разьвіцьцё калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Мы можам адзначыць, што партарганізацыя, хаця і з некаторым спазьненьнем, здолела ў вогуле ліквідаваць «прышчэпаўшчыну», якая была клясчыным выяўленьнем на практыцы праваапартыўністычных тэорый аб пастаянных уступках капіталістычным элемэнтам вёскі, аб «мірным урастаньні кулака ў сацыялізм» і на справе вяла да капіталістычнай рэстаўрацыі.

Партыі прышлося правесьці сур'ёзнейшую барац

ГЭРАІЧНЫ ШЛЯХ

(На выстаўцы друку габінэту журналістыкі пры Беларускім Камвузе)

Шлях бальшавіцкага друку — шлях барацьбы рабочае клясы за пралетарскую дыктатуру. Вось чаму на выстаўцы друку ў Камвузе так выразна паўстаюць у памяці этапы вялікай гэраічнай барацьбы пралетарыяту.

Першы разьдзел выстаўкі ўключае дакастрычніцкі друк с.-д. партыі.

1900 год. «Искра» ў першым нумары рашуча выступае супроць няправільнай меншавіцкай тэорыі, быццам пераважнае значэньне мае эканамічная барацьба з адсоўваньнем на другі, плян палітычных задач пралетарыяту. «Искра» акрэсьлівае галявую задачу сваёй партыі: «бліжэйшай палітычнай задачай расійскай рабочай партыі павінна быць — зьвяржэньне самаўладзтва, заваяваньне палітычнай свабоды». Газэта пад палітычным кіраўніцтвам Уладзімера Ільліча Леніна кліча на штурм самаўладзтва.

У 1904 годзе «Искра» застаецца ў руках меншавікоў. Ёй процістаўляецца бальшавіцкая газэта «Уперад», а ў 1905 годзе «Пралетары». Са старонак бальшавіцкіх газэт нясуцца запальваючыя рэвалюцыйныя лёзунгі, баявыя палітычныя заклікі, выкрываецца клясавая прырода буржуазных лібэралаў, сацыял-рэвалюцыянэраў і інш.

Бурны ўздым рэвалюцыйнай хвалі 1905 году вынес рабочы друк з падпольля на сьвет. Вось «Известия Петроградского Совета Рабочих Депутатов». Фармальна беспартыйныя «Известия» саветаў носяць характар баявога органу рабочае клясы, якая арганізавана ў саветах і цесна зьвязана з с.-д. партыяй. Пачынаюць выходзіць і бальшавіцкія газэты «Новая Жизнь» у Ленінградзе, якою кіруе Уладзімер Ільліч Ленін, у Маскве выходзіць бальшавіцкая газэта «Борьба» і г. д.

Разгром рэвалюцыі 1905 г. зьнішчае і малады бальшавіцкі друк.

Толькі ў 1910 годзе пачынае выходзіць легальная газэта «Зьвязда», як с.-д. орган. У 1911 годзе яна ўжо выходзіць, як орган бальшавікоў. Потым пачынаецца слаўная эпоха «Правды». Яна прадстаўлена на выстаўцы асобным разьдзелам.

Дакастрычніцкі бальшавіцкі друк адыграў вялікую арганізуючую ролю ў падрыхтоўцы бальшоў на кастрычніцкія барыкады. 1917 год. Падняўся пралетарыят і працоўнае сялянства. Скінута самаўладзтва, але на чале ўлады не пралетарыят, а буржуазны ўрад Керанскага. Трэба выкрыць сапраўдную прыроду часовага ўраду. Гэта робіць газэта «Правда», якая ставіць пытаньне аб задачах і тактыцы пралетарыяту ў рэвалюцыі. Яна выкідвае лёзунгі «ўлада саветам», «супроць імпэрыялістычнай вайны».

Перамог пралетарыят. Але з усіх бакоў цесным кольцам сьціснула маладую рэспубліку сусьветная контр - рэвалюцыя. Бальшавіцкі друк мабілізуе працоўныя масы на барацьбу з ворагамі ўлады рабочых і працоўных сялян. Лік бальшавіцкіх газэт расьце. Замест адзінак выходзяць сотні.

Вось «Менскі пралетары» паведамляе аб праведзенай з посьпехам мабілізацыі камуністых на фронт і пераходзе калчакоўцаў на бок чырвоных. «Известия» — газэта Бабруйскага рэвалюцыйнага камітэту — урачыста паведамляе, што Чырвоная армія заняла Пухавічы, Слуцак, Калінкавічы.

На шэрай або рознакаляровай паперы газэты клічуць на абарону Кастрычніцкіх заваяваньняў.

1922-23 год. Зьмяняецца абстаноўка. Новыя тэмы высоўвае барацьба пралетарыяту за канчатковую перамогу.

«На гаспадарчы фронт! На адбудову гаспадаркі, зруйнаванай імпэрыялістычнай і грамадзянскай вайной!» — голасна заклікае друк. Адначасова зьяўляюцца ў газэтах перадавыя артыкулы на новыя тэмы: «трэба ехаць вучыцца», «аб калектыўных гаспадарках», «бліжэйшыя задачы каапэрацыі» і г. д.

Прайшоў этап адбудовы народнае гаспадаркі. Пралетарыят на чале сваёй камуністычнай партыі ўзяўся за сацыялістычную рэканструкцыю народнае гаспадаркі.

Друк мабілізуе масы вакол асноўных задач і лёзунгаў партыі, друк упарта змагаецца за ажыцьцяўленьне наказу Леніна — «дагнаць і перагнаць перадавыя капіталістычныя краі».

Увесь гэты гэраічны шлях бальшавіцкага друку добра паказан на выстаўцы, якая арганізавана габінэтам журналістыкі.

Ёсьць тут і спэцыяльны разьдзел замежнага камуністычнага друку, асобныя разьдзелы слаўнага шляху нашай «Зьвязды», друку асобных рэспублік СССР і нацменшасьцяй СССР, новага атраду калгасных і фабрычна - заводзкіх газэт, якія ўжо налічваюцца тысячамі па СССР, ёсьць разьдзелы вайсковага друку, юнацкага друку СССР і г. д. Асобным разьдзелам прадстаўлен замежны фашысцкі друк, дарэвалюцыйны рэакцыйны друк і г. д.

Вельмі карысна наведаць гэтую выстаўку. Мы лічым патрэбным працягнуць тэрмін існаваньня выстаўкі. Трэба даць магчымасьць наведаць яе як мага большай колькасьці рабочых і працоўных сялян.

Р. Д.

МЕНСК

Цэнтральныя ўстановы ігнаруюць устаноўленыя стаўкі

Скончылі сваю работу брыгады ЦСПСБ і НКП, якія правяралі пастаноўку дзяржнармаваньня ў дзяржаўных і гаспадарчых установах г. Менску. Праверкай выяўлена, што многія ўстановы самавольна падвышалі і зьніжалі, бяз ведама НКП, пэнсію сваім супрацоўнікам.

Напрыклад, у ВСНГ інжынэру плянавай групы вызначана месячная пэнсія ў 350 руб., а ён фактычна атрымлівае 400 руб., інжынэр папяровай прамысловасьці паводле дзяржнармаваньня павінен атрымліваць 300 руб., а яму вызначана 325 руб.

У Белторфе загадчыку аддзелу забесьпячэньня вызначана ў месяц 200 руб., а ён атрымлівае 225.

У Белпчацінэ бухгальтар павінен атрымліваць 200 руб., а яму вызначана 210 руб., з другога боку яго намесьнік павінен атрымліваць пэнсію—150 руб., а атрымлівае 140. Рахункавод—касір замест вызначаных 90 руб. атрымлівае толькі 55.

Усе гэтыя факты сьведчаць аб тым, што многія цэнтральныя ўстановы ігнаруюць пастановы НКП аб дзяржнармаваньні ставак і такім чынам, уносяць рознабой у гэту работу.

Выпуск чырвоных настаўнікаў

18 мая ў клюбе працаўнікоў асьветы адбыўся восьмы выпуск студэнтаў Белпэдтэхнікуму.

З прывітаньнямі выступалі прадстаўнікі партыйных, камсамольскіх і прафэсыянальных арганізацый. Віталі таксама выпускнікоў прэзыдэнт Беларускай Акадэміі Навук тав. **Ігнатоўскі** і народны паэта **Якуб Колас.**

Усяго выпушчаны ў гэтым годзе 73 чырвоныя настаўнікі.

Чырвонае настаўніцтва разьдзецца ў глухія куткі Беларусі для выхаваньня сялянскіх дзяцей, для прасоўваньня беларускай пралетарскай культуры ў шырокія працоўныя масы.

АБ'ЯДНАНЬНЕ РАБОЧАЙ І ТРАНСПАРТНАЙ КААПЭРАЦЫІ

16-га мая спыніла сваю дзейнасьць транспартная спажывецкая каапэрацыя, якая аб'яднаецца з МЦРК. Гэта аб'яднаньне выклікана няматэзгоднасьцю існаваньня транспартнай каапэрацыі, як паасобнай спажывецкай адзінкі, абслугоўваючай выключна транспартнікаў.

Усяго да МЦРК далучаецца 21 гандлёвая адзінка (крамы, ларкі і сталоўкі), з штатам у 185 чал.

НАВІНЫ МЦРК

МЦРК адкрыў сталоўку на Менскім аэрадроме для лётнікаў. Апрача таго адкрываюцца дзьве сталоўкі ў пяхотных і артылерыйскіх лягерах. З 25-га мая будут функцыянаваць цэрабкопаўская сталоўкі ў кавалерыйскіх лягерах і ў Ждановічах.

За дзень

У сувязі з правядзеньнем двухтыднёвіка барацьбы з вясковымі пажарамі інспэкцыя пажарнай аховы НКУС абвясьціла конкурс на лепшы раён, у якім добра пастаўлена антыпажарная справа. Для лепшых раёнаў НКУС вызначыў тры прэміі ад 200 да 500 руб.

***

У зьвязку з тым, што да гэтага часу ўсе пажарныя дружыны прадпрыемстваў працавалі бясплянава і стыхійна, што ставіла пад вялікую пагрозу ахову прадпрыемстваў ад пажараў, інспэкцыя пажарнае аховы НКУС выпрацавала тыповы статут для фабрычна - заводзкіх пажарных дружын.

***

У бліжэйшым часе ў Менску будзе адкрыты фабзавуч для падрыхтоўкі кваліфікаваных аўтаработнікаў.

***

23-га мая ЦП саюзу гарбароў склікае ў Менску шырокую гараздзкую канфэрэнцыю членаў саюзу гарбароў па пытаньні аб правядзеньні кампаніі перавыбараў ФЗМК. На канфэрэнцыі будзе пастаўлены даклад прадстаўніка ЦК саюзу гарбароў т. **Грыгор'ева** аб выніках чысткі апарату ЦК саюзу гарбароў.

***

Гэтымі днямі ў Менску, у трамвайным парку, адкрываюцца курсы па падрыхтоўцы вагонаважатых. Тэрмін навучаньня — паўтара месяцы.

***

Гэтымі днямі Белдзяржкіно адкрыла курсы па падрыхтоўцы кіно-мэханікаў на 80 чалавек. Тэрмін навучаньня на курсах—6 месяцаў. Усе кіно-мэханікі па сканчэньні гэтых курсаў будуць накіраваны на работу ў калгасных і саўгасных кіно-перасоўках.

***

20-га мая ў Менску адкрываюцца курсы па падрыхтоўцы беспрацоўнае моладзі ў фабзавучы. Усяго на курсы будзе прынята 230 чал. Тэрмін навучаньня —3 месяцы. Усе курсанты будуць забясьпечаны інтэрнатам.

***

Гэтымі днямі ў Менску адбылася шырокая нарада інспэктароў народнае асьветы Менскае акругі. Нарада разгледзела пытаньне аб усеагульным навучаньні ў акрузе, культмасавай рабоце ў калгасах і саўгасах на летні час, аб рабоце па ліквідацыі няпісьменнасьці і г. д.

***

Гэтымі днямі варочаюцца ў Менск дэпутаты Менгарсавету, якія былі пасланы для працы ў вёску. Прэзыдыум гарсавету запрапанаваў усім сэкцыям заслухаць справаздачы гэтых членаў гарсавету аб выкананай імі рабоце на вёсцы.

***

Гарсавет запрапанаваў Транспартнаму трэсту дазволіць дармовы праезд на трамваі чырвона-штандартнікам пры прад'яўленьні імі пасьведчаньня.

КІНО - НАВІНЫ

Белдзяржкіно прыняло сцэнары Л. Кацовіча пад назвай «10 год». Гэты сцэнары адбівае жыцьцё і сацыялістычнае будаўніцтва БССР за 10 год і прысьвечаны 10-гідзьдзю са дня вызваленьня Беларусі ад белапалякаў.

Рэарганізацыя менскай біржы працы

У хуткім часе менскай біржа працы пераходзіць на новыя мэтады работы. Замест існуючых сэкцый будуць працаваць—бюро па пасылцы на працу, бюро даведак, рэгістрацыі беспрацоўных і г. д.

На правядзеньне гэтай рацыяналізатарскай работы Наркампрацы адпусціў 50.000 рублёў.

У функцыі біржы працы будзе ўваходзіць таксама кіраўніцтва працкалектывамі, выдача дапамогі, падрыхтоўка кадраў і інш.

У сувязі з усёй гэтай рэарганізацыяй будуць павялічаны штаты працаўнікоў біржы працы.

Загатоўка мяса ідзе слаба

Паводле тэлеграфных вестак, атрыманых ад акргандляў, загатоўка мяса ў першую дэкаду мая праходзіла наогул слаба: замест 1.500 тон загатоўлена толькі 300 тон, што складае ўсяго 20 проц. З асобных акруг на першым месцы ідзе Магілеўская, якая выканала 38 проц. заданьня, за ёю Аршанская —36 проц., далей Віцебская і Гомельская—па 22 проц., Менская—17 проц., Бабруйская—16 проц. і Мазырская—14 проц. З Полацку вестак не атрымана.

Гэтыя лічбы сьведчаць аб тым, што загатоўшчыкі не зразумелі поўнасьцю ўсяго значэньня выкананьня пляну мясазагатовак.

Што адкажа на гэта віцебскі рабфак

З 1-га мая пачалі працаваць батрацкія курсы па падрыхтоўцы ў віцебскі рабфак. Курсы разьлічаны на **250 батракоў**, якія зьехаліся з розных раёнаў БССР. Здавалася, што кіруючыя органы рабфаку зробяць усё, каб паставіць на належную вышыню работу курсаў і даць магчымасьць 250 батраком паступіць у рабфак.

Аднак, з першых крокаў курсаў ужо відаць, што гэта справа не знайшла сур'ёзнага падыходу з боку арганізатараў курсаў. Галоўнае пытаньне — заданьне курсаў настаўнікамі. Каго-ж вылучылі? А вось узялі студэнтаў першага і другога курсу рабфаку, сказаўшы іх: «ідзеце вучыць батракоў». Між тым, каму-ж ня ясна, што рабфаковец 1-га і 2-га курсу — слабы настаўнік ужо таму, што сам мала ведае. Ня дзіўна, што батракі-курсанты не задаволены такімі адносінамі да сябе. Мы просім «Зьвязду» растлумачыць нам, ці міжна так падрыхтоўваць батрацтва ў рабфакі?

Случчанін.

Арабочым савецкі апарат

Арганізаваныя пры ЦК КП(б)Б курсы скончылі 109 рабочых-вылучэнцаў, у тым ліку 26 жанчын. Усе яны за накіроўваюцца на работу ў розныя ўстановы. На здымку рабочыя - вылучэнцы: 1. БЕЛЕНЬКАЯ—работніца Маріінскай цукеркавай фабрыкі; 2. СТАНКЕВІЧ—рабочы фабрыкі «Спартак»; 3. СЕМАШЧУК — чыгуначнік; 4. АРЛОЎСКІ — рабочы Магілеўскай электрастанцыі

З ЛІСТОУ РАБСЕЛЬКОРАУ

ШКЛЯНОЕ НАЧЫНЬНЕ ТРЭБА ЗЬБІРАЦЬ

Шкляное начыньне як пабітае, так і цэлае выкідаецца ў памыйныя ямы. На кожным дварэ валяюцца цэлыя бутэлькі ад піва, воцату, чарніла і г. д.

Бутэлькі з-пад віна назад ня прымаюцца. Аб'яднаньню шкляной прамысловасьці трэба прыняць адпаведныя меры і зрабіць захады да забесьпячэньня збору шкляного начыньня.

Зацікаўлены.

ЗРЫВАЕЦЦА БУДАЎНІЦТВА

Сельска - Гаспадарчая Акадэмія да кастрычніка м-ца павінна скончыць пабудову галоўнага корпусу і інтэрнат для студэнтаў. Але будаўніцтва зрываецца з-за адсутнасьці будаўнічых матар'ялаў. Так, цэглы ёсьць 150 тысяч штук, а патрэбна каля 5 млн. шт. Нястача цэмэнту, зусім адсутнічаюць балькі і бляха для крыцьця.

Не заключан дагавор з Белдзяржбудам аб будаўніцтве. Апрача гэтага, рабочыя сэзоньнікі знаходзяцца ў дрэнных бытавых умовах. Ніякай культурнай работы не праводзіцца.

Міх. Сонін.

ЗЬНІШЧАЮЦЬ ЖАРАБЯТ

У **Бягомльскім** раёне ўвайшло ў сыстэму зьнішчаць жарабят. Кожны базарны дзень загатоўшчыкі цэлымі табунамі гоняць жарабят на забой.

Такое становішча зьяўляецца зусім ненармальным і пагражае гадоўлі коняй. У гэтым годзе раённымі арганізацыямі выдаткавана каля 40 тыс. руб. на набыцьцё коняй у другіх раёнах.

Трэба пакласьці канец зьнішчэньню жарабят.

А.

НЕПАРАДКІ НА ЗАВОДЗЕ ІМЯ РОЗЫ ЛЮКСЭМБУРГ

На заводзе імя **Розы Люксэмбург** (Нова-Барысаў) маюць месца факты нядбайнасьці. Склады сырцу завалены лесам вышэй пляцформы, што небясьпечна.

Лес адгружаецца ўзмоцненым тэмпам, а гэта не дае магчымасьці падабраць звал.

Акрамя таго, лес знаходзіцца ў кары, ад чаго ён псуецца. Цана на разгрузку павялічылася ад 1 руб. да 4 рублёў за пляцформу.

Разам з гэтым, разгрузка пагражае жыцьцю рабочых. Меў месца выпадак, калі рабочага прыціснула бервяном.

РСІ, зьвярні ўвагу.

Свой.

ДА ВЫСТАЎКІ НЕ ПАДРЫХТАВАНЫ

Самахвалавіцкія раённыя арганізацыі да апошняга часу не прыступілі да работы па падрыхтоўцы да Ўсебеларускай сельска - гаспадарчай выстаўкі. Выстаўка адводзіць значнае месца жывёлагадоўлі, а таму неабходна было-б прадставіць на выстаўку чырвона - беларускую скаціну, якая ёсьць у раёне.

Насельніцтва раёну зусім мала ведае аб выстаўцы.

Аграномам і зоатэхнікам трэба растлумачыць насельніцтву аб значэньні выстаўкі.

М. ЧУБАР.

ЧАТЫРЫ ГАДЫ НЯМА АДКАЗУ

Яшчэ ў 1926 годзе сяляне 16 населеных пунктаў **Смалявіцкага** раёну падалі хадайніцтва кіраўніцтву дарог МБВ чыг. аб тым, каб пасажырскія цягнікі спыняліся на 723 кілёмэтры. Прайшло ўжо каля 4-х год, а адказу сяляне не атрымалі.

Калі будзе адказ?

Аім.

З ТЭХНІКАЙ НЕБЯСЬПЕКІ ДРЭННА

Адміністрацыя **Чавускага** райкамбінату ня прымае ніякіх мер па тэхніцы небясьпекі. Машыны не агароджаны і ня вывешаны правілы, як хадзіць каля машын. У выніку гэтага ўжо на камбінаце адбыліся два няшчасныя сьмяротныя выпадкі.

Адміністрацыя павінна панесьці адказнасьць.

П—к.

ВЫСЯЛЯЮЦЬ СЕМ'І РАБОЧЫХ

Двое рабочых заводу **«Праца»** (Мазырчына) накіраваны на курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ. Сем'і гэтых рабочых засталіся жыць пры заводзе. Але адміністрацыя заводу прапанавала гэтым сем'ям выбрацца з кватэр. У выніку гэтыя рабочыя вымушаны будуць пакінуць курсы, бо са стыпэндыі пражыць сям'ю і наняць кватэру немагчыма. Заводзкія арганізацыі зьвярнецце ўвагу.

І. І.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЕНЬНЯ

Дом працасьветы. Экстраны сход камсамольскіх школьных цэх'ячэек Працасьветы. Пач. у 18½ гадз.

— **Палітзаняткі** па падрыхтоўцы да палітбою. Яўка камсамольцаў палітасьветна цэхячэйкі абавязкова. Пач. у 19 гадз.

Клюб Ільліча (таварная). Пашыраная фракцыя ЖАКТ'у № 19. Яўка камуністых, што жывуць у жакце № 19, абавязкова. Пач. у 19 гадз.

БАН. Пасяджэньне катэдры марксызму-ленінізму. Працяг спрэчак па дакладзе тав. **Сакерскай.** Праблема кансэрватыўнага і рэвалюцыйнага ў ідэалёгіі. Увах. вольны. Пач. у 13 гадз. дня.

ЗАЎТРА

Пашыр. пленум Фрунз. РК МОПР'у ў памяшк. Мен. АК МОПР'у. Пач. у 19 гадз. Парадак дня: 1. Справаздача прэзыдыуму РК. 2. Аб летняй рабоце і рабоце в сэзоньнікамі і 3. Давыбары райкому. Запраш. актыў.

Курсы пры рабфаку БДУ па падрыхтоўцы ў дзенны і вячэрні рабфакі. Камісія па прыёме на курсы паведамляе, што 21-га мая ў 19 гадз. у памяшканьні рабфаку (2-гі паверх) адбудзе аг. сход таварышоў, падаўшых заявы аб прыёме на курсы. Яўка абавязкова.

Да ведама хатніх работніц мясцкому № 2. У 19 гадз. (клюб Нархарч, Энгельса, 6), аг. сход хатніх работніц. Пасля кіно.

Навуковая асацыяцыя. У 21 г. (клюб «Мэдпрацаўнік»)—8-мы аг. сход членаў навуковай асацыяцыі пры ОСО М. С. ПР.

Парадак дня: 1. Вечар памяці доктара **Эпштэйна,** 2. Рэарганізацыя мэдфакультэту БДУ (проф. **Кроль**), спрэчкі па дакладу праф. **Бурака**—склярома дыхавых трубаў.

АД КАМІСІІ ПА ЧЫСТЦЫ АПАРАТУ НАРКАМГАНДЛЮ

Назначаны на 22 мая сход па абмеркаваньні вынікаў праверкі работы Наркамгандлю пераносіцца на 26 мая тое-ж памяшканьне.

Ад музэю рэвалюцыі БССР. У сувязі з рамонтам памяшк. музэю і падрыхтоўкай яго да ўсебеларускай выстаўкі з 20 мая экскурсіі ў музэй, як калектыўныя, так і індывідуальныя спыняецца.

25-га мая Культпроп Менакругкома КП(б)Б выпускае аднадзенную друкаваную газэту «За марксыцка-ленінскую вучобу». Культпроп просіць слухачоў прапагандыстых усёй сеткі партыйнай асьветы даць свае заметкі ў газэту партасьвеце. Матар'ялы дасылаць культпроп АК т. ОРЛІСУ.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

ПРАЦЯГ ЧЫСТКІ АПАРАТУ БЕЛКААПСАЮЗУ

пераносіцца ў клюб Саўгандальслужачых сеньня, 20 і заўтра 21 мая з 6 гадзін 30 мін.

Чыстку будуць праходзіць супрацоўнікі Нарыхтоўчага аддзелу **Белкаапсаюзу.**

ЗАПРАШАЮЦЦА РАБОЧЫЯ і СЛУЖАЧЫЯ.

Камісія.

СЁНЬНЯ, а 7 г. увеч., у памяшканьні Кастрычнікаўск. РК КП(б)Б (пр. К. Маркса і Урыцкага) адбудзецца

Пашыраны пленум Кастр. РК МОПР

з наступнай павесткай дня:
1. Справаздача прэзыдыуму РК.
2. Аб летняй працы і працы сярод сэзоньнікаў.
3. Давыбары райкому. 4. Рознае.

Павінны абавязкова зьявіцца члены пленуму, старшыні і сакратары яч. МОПР.

Запрашаецца актыў. Фракцыя а 6 гадз. увечары.

Кастр. РК МОПР'у.

ПАДПІСВАЙЦЕСЯ ЗАГАДЗЯ НА ЧЭРВЕНЬ і далейшыя м-цы на газэту „ЗЬВЯЗДА“

ПАМЯТАЙЦЕ, што ў ЧЭРВЕНІ м-цы ў „Зьвязьдзе“ будуць друкавацца НАЙБОЛЬШ ПОУНА ўсе матар'ялы **XIII зьезду КП(б)Б**

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР Адкрыцьце летняга сэзону тэатру **„КРАСНЫЯ ФАКЕЛ“** Аўторак, 20-га мая **ТОЛЬЛЕР**

ГОП-ЛЯ, МЫ ЖЫВЁМ.

Пачатак а 8 з пал. гадз. увеч.

КІНО-ТЭАТР **КУЛЬТУРА** — Мастацкі фільм вытворч. „ВОСТОККІНО“ **ТУРКСІБ** (Сталёвы шлях) кіно-нарыс у 5-ці частках. Кіно-хроніка Совкіно № 23. ЗВЫШ ПРАГРАМЫ)(2-гі ТЫДЗЕНЬ тэатр кітайскіх ілюзій **ЛЮ-ФУ** па зусім новай праграме. Пачатак сэансаў: 7 г., 8 г. 30 м., 10 г. Каса—ад 5 гадз.

КІНО **ПЕТЭРБУРГСКАЯ** — З прычыны посьпеху)—(2-гі тыдзень. Замежны мастацкі фільм **АПОШНІЯ НАВІНЫ**. Звыш праграмы)—(культурфільм **КАЛМЫКІ**. Пачатак 1-га сэансу а 7 г. увеч. | Каса ад 5 г.

КІНО **ПРАЛЕТАРЫ** — Амэрыканскі фільм **ЧОРНЫ ЦЫКЛОН** у 6-ці частках. У галоўных ролях— А. РЭКС і Х. АЛЕН. Звыш праграмы — **КУЛЬТУРФІЛЬМ** -) **КАМЧАТКА** ў 1-ой частцы (-. Пачатак 1 сэансу а 7 г. Каса адчынена ад 5 гадз.

1-ы дзіячы кіно-тэатр **„ЮНЫ ПІЯНЭР“** — Мастацкі фільм **БЕЛЫ НАЕЗЬНІК** (Бог вайны) кіно-п'еса ў 6-ці частках. Звыш праграмы—культурфільм **ДАГЕСТАН** у 2-х частках. Пачатак 1-га сэансу а 2 г., 2-га—3 г. 30 м. Каса адчынена—з 12 г. дня.

КІНО **СПАРТАК** — мастацкі фільм **ЧАЛАВЕК з ПАРТФЭЛЕМ** драма ў 6 частках. Пач. сэансаў: 7 г. 15 м., 9 г., 10 г. 30 м. Каса—з 5 гадз. 30 м.

ЗАОЧНЫЕ ГОСКУРСЫ РОСПИСИ (РАЗРИСОВКИ). Роспись по всевозможным тканям: **мягким** золот., серебр., маслян., рельефн. анилин. не расплыв. **красками.** Бисерн., жемчужн. и мерцающ. **переплетками. Роспись по сосудам, стеклу, целлулоиду, коже и дереву.** Полный курс, 12 уроков в 4 мес. К урокам дается свыше 100 рис. (кроме текстовых). По оконч. выд. свидет. Уменье рис. не требуется. Проспект и программа высыл. за 20 коп. мел. мар.

ЗАОЧНЫЕ КУРСЫ СОНО.

МОСКВА, ул. Дзержинского, д. 1.

Беларуская кантора „ОРГСТРОЙ“

Адводзіць да ведама ўсіх устаноў і прадпрыемстваў, што, лічачыся з тэхнічнымі труднасьцямі прыгатаваньня бланкаў

ДЛЯ СТАНДАРТНАЙ ФОРМЫ РАХУНКУ,

распрацаванай Праўленьнем Дзяржбанку сумесна з ІТУ, зацьверджанай Наркаматам РСІ СССР і якія будуць уведзены у абавязковым парадку з 1-VI г. г. (гл. Изв. ад 11 мая за № 128), бю прыняты меры для загатаваньня гэтых рахункаў ў цэнтралізаваным парадку.

Першая партыя рахункаў мае паступіць на склады Оргстроя да 1 чэрвеня г. г.

Усе зацікаўленыя арганізацыі павінны прадставіць свае **заяўкі да 25 мая** з паказаньнем колькасьці рахункаў, якая патрэбна ім да 1 кастрычніка г. г.

У заяўцы трэба паказаць фармат рахункаў (210×297 м/м ці 105×148 м/м).

Заяўкі адрасаваць Беларускай канторы „Оргстрой“, г. Менск, Савецкая, 55.

„ОРГСТРОЙ“

МАШЫНІСТКА

патрэбна на сталую працу у рэд. газ. „Зьвязда“

Ільна-Пяньковаму Аб'яднаньню ВСНГ БССР

(Менск, пляц Волі, 21-1)

ПАТРАБУЮЦЦА

для работы на заводах па першапачатковай апрацоўцы — ільну: —

1) **АГРАНОМЫ па першапачатковай апрацоўцы ільну,**

2) **ПРАКТЫКІ-БРАКЕРЫ, якія добра ведаюць сартаваньне ільняной саломы, трэсты і валакна.**

Паказаныя асобы спачатку будуць накіраваны на ільна-заводы для перакваліфікацыі, пры чым ім будзе захована пэнсія з выплатай сутачных.

ЗАРПЛАТА ПА ЗГОДЗЕ

Заявы з кароткім жыцьцяпісам і паказаньнем практычнае стажу накіроўваць па вышэйпаказаным адрасе.

АД'ЯЖДЖАЮЧЫ Ў ВОДПУСК

у дом АДПАЧЫНКУ, на КУРОРТ,

атрымлівайце газ. „ЗЬВЯЗДА“

па месцы знаходжаньня ў водпуску, паведаміўшы ў аддзел падпіскі газ. „ЗЬВЯЗДА“

ВАШ НОВЫ АДРАС.

Газэта будзе дасылацца на новым адрасе

без асобнай даплаты.

К XVI С'ЕЗДУ ПАРТИИ

ДЛЯ ПРОРАБОТКИ ЗАДАЧ и РЕШЕНИЙ XVI С'ЕЗДА ПАРТИИ ИСЧЕРПЫВАЮЩИЕ МАТЕРИАЛЫ, НАЧИНАЯ С ИЮНЯ, ДАДУТ ПАРТИЙНЫЕ ЖУРНАЛЫ:

ПАРТИЙНОЕ СТРОИТЕЛЬСТВО Орган ЦК ВКП(б) 24 №№ в год. Цена с 1-VI до конца года—2 р. 95 к.

СПУТНИК АГИТАТОРА для города и для деревни. Орган отделов агитации и массовых кампаний ЦК и МК ВКП(б). 36 №№ в год. Цена с 1-VI до конца года 3 руб. 59 коп. | 36 №№ в год. Цена с 1-VI до конца года—1 руб. 80 коп.

КОММУНИСТИЧЕСКАЯ РЕВОЛЮЦИЯ Орган Культпропа ЦК ВКП(б). 36 №№ в год. Цена с 1-VI до конца года — 4 руб. 55 коп.

ПРОПАГАНДИСТ Орган Культпропа МК ВКП(б). 24 №№ в год. Цена с 1-VI до конца года—2 р. 70 к.

Всем подписавшимся на эти журналы с 1 июня до конца 1930 года будет дано бесплатное приложение материалов по итогам с'езда.

ПОДПИСКА ПРИНИМАЕТСЯ отделом подписки Госиздата РСФСР—Минск, Советская, 54 и во всех отделениях и магазинах Госиздата РСФСР

ОТДЕЛ ПОДПИСКИ ГИЗ РСФСР.

Згубленыя і ўкрадзеныя

наступныя дакументы лічыць несапраўднымі:

Камс. біл. № 561246, выд. Жураўлеўскім РК ЛКСМУ, пасьведч., выд. ДПУ на права нашэньня зброі на імя Пападзіадзі А. З. 903-904

Парт. біл. № 1100609, выд. Мен. АК КП(б)Б, асаб. пасьведч., выд. Бел. с.-г. Акадэміяй на імя Парахневіча В. 905-906

Камс. біл. № 124795, выд. Арп. АК ЛКСМБ, чл. біл. саюзу СГС № 4256 на імя Валуева М. П. 907-908

Паявая кн. № 2512 Афроімава Л, выд. Копыльск. спаж. т-вам. 909

Залік. кн. Радкевіча А. В., выд. БДУ 910

Вайск. кн. Граковіча І. І., выд. Мен. ваенкаматам. 911

Канд. карт., выд. Бабруйск. АК КП(б)Б, вайск. кн., выд. Бабр. ваенкаматам, пасьведч., выд. сьвіналоводн. курс. НКЗ Бел. на імя Белага. П. Я. 912-914

Чл. біл. саюзу будаўн. № 45193 Зеневіча С. А. 915

Чл. біл. саюзу мэдсанпрацы, бірж. талён, выд. Мен. бірж. працы, каапэр. кн., выд. Засл. спаж. т-вам, даведка аб працы, выд. Бацэвіцкай больніцай, даведка аб выбарч. правох, выд. Гатовінск. с/с. на імя Грудзінка С. С. 916-920

Асаб. кн. № 15, выд. б. Сьмілавіцк. ВВК на імя Гаўрылычыка І. А. 921

Каапэрац. кн. Камоцкага А. О., выд. Мен. прыгар. спаж. т-вам «Земляроб» 922

Пашп. Баран. Э. М., выд. Мен. міліцыяй 923

Чл. кн. саюзу чыгуначн. Высоцкага П. П. 924

Бірж. карт. Розін С. З., выд. Мен. бірж. працы. 925

Парт. біл. № 0818442 Чэрныш М. К. 926

Фабрычны табельны нумар «373» Апарцавай В. І., выд. галянт. ф-кай «Беларуска» 927

Чл. біл. саюзу швэйнікаў, лек. кн., выд. Менстрахкасай, кн. ашчаднай касы на імя Крашынскага Г. І. 928-930

Асаб. пасьведч. Крычалава Н. С., выд. Жлобінск. РВК. 931

Чл. кн. саюзу харчавікоў, вайск. кн., выд. Мен. ваенкаматам на імя Марголіна М. Д. 932-933

АБВЯШЧЭНЬНЕ.

Народны суд Лепельскага раёну, Полацкай акругі,

на падставе прыгавару за 15 красавіка 1930 г. абвяшчае

грамадзкае ганьбаваньне

тэхніку Лепельскага Камгасу

НЕПЛЮКОВУ Аўгену Якубаву

за надбайныя адносіны да службовых абавязкаў.

Друкарня газэты «Зьвязда», Менск. Менск, Галоўлітбел № 337.